МОСКВА 19.
ул. Фрунзе 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36 г.

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

23 КРАСАВІКА 1936 Г., ЧАЦВЕР | № 93 (5467).

НЯХАЙ ЖЫВЕ СОВЕЦКАЯ МОЛАДЗЬ

Скончыў сваю работу X усесаюзны з'езд ленінскага комсамола.

Цэнтральным лозунгам, пад якім праходзіў з'езд комсамола, з'яўляўся лозунг — вучыцца, вучыцца і вучыцца.

Гэты лозунг вынікае з прамых указанняў **Леніна** і **Сталіна** аб рабоце комсамола.

Сакратар ЦК ВКП(б) тав. **Андрэеў** у сваім выступленні гаварыў: «Калі перад з'ездам комсамола абмяркоўвалася, якія пытанні паставіць на з'ездзе і пад якім кутом правесці работу з'езда, таварыш **Сталін** прама сказаў, што, па яго думцы, з'езд комсамола павінен прайсці пад знакам арганізацыі вучобы і выхавання.

Так, таварышы, і трэба зрабіць, як раіў таварыш **Сталін**. Увесь пафас комсамольскай работы і ўсю героіку нашага ленінскага комсамола трэба перанесці цяпер на вучобу. У гэтым галоўнае».

Вучоба з'яўляецца той неабходнай якасню, без якой нямыслімэ работа кожнай комсамольскай арганізацыі. Авалодваць вышынямі марксізма-ленінізма, авалодваць багацейшай невычэрпальнай скарбніцай прац **Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна**, — вось над чым павінны працаваць комсамольскія арганізацыі.

Комсамольцы з'яўляюцца перадавой часткай усёй совецкай моладзі. Кожны комсамолец павінен быць усебакова развіты і адукаваны. Авалодваць навукай ва ўсіх яе розностайных галінах, з кожным днём павышаць свой палітычны і адукацыйны ўзровень — важнейшая задача кожнага комсамольца.

«Тэорыя — гаворыць таварыш **Сталін** — ёсць вопыт рабочага руху ўсіх краін, узяты ў яго агульным выглядзе. Вядома, тэорыя становіцца беспрадметнай, калі яна не звязваецца з рэволюцыйнай практыкай, так-жа сама як і практыка становіцца сляпой, калі яна не асвятляе сабе дарогу рэволюцыйнай тэорыяй».

Гэта ўказанне правадыра нашай партыі з'яўляецца той баявой праграмай, на якой павінна будавацца ўся работа комсамола.

Ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі павінен разгарнуць работу па далейшаму ўцягненню ўсёй моладзі ў стаханаўскі рух. Комсамольцы павінны стаць застрэльшчыкамі далейшага разгортвання стаханаўскага руху ў прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, у абарончай рабоце і ў іншых галінах шматграннай социялістычнай будоўлі.

X з'езд прыняў новую праграму і статут комсамола. Гэта — сталінская праграма, сталінскі статут.

Кожны радок, кожнае слова насычаны ў іх сталінскай мудрасцю, геніяльнасцю і празорлівасцю.

З праграмы комсамола вырысоўваецца правобраз будучага чалавека — чалавека комуністычнага грамадства, глыбока ідэйнага, высока культурна развітага, маральна чыстага, мужнага, благароднага.

Ленінскі комсамол прыняў на сябе велізарнейшыя задачы арганізацыі вучобы і комуністычнага выхавання ўсёй совецкай моладзі.

Гэта — выключна вялікая, адказная і баявая задача комсамола. Для выканання гэтай задачы трэба накіраваць увесь комплекс арганізацыйнай, масавай і выхаваўчай работы, усіх комсамольскіх арганізацый.

Таварыш **Сталін** сваёй папраўкай да праграмы комсамола пановаму вызначыў сутнасць і характар Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі.

«Усесаюзны Ленінскі Комуністычны Саюз Моладзі, — гаворыцца ў праграме комсамола, — з'яўляецца масавай беспартыйнай арганізацыяй, прымыкаючай да ВКП(б), яднаючай у сваіх радах шырокія слаі перадавой палітычна граматнай працоўнай моладзі горада і вёскі».

Гэта азначае, што цяпер адкрываюцца новыя гарызонты для работы комсамола. Адмяняецца практыка рэгулявання социяльнага складу пры прыёме ў комсамол. Комсамол павінен стаць больш шырокай арганізацыяй перадавой совецкай моладзі.

Шырэй і смялей уцягваць у свае рады перадавую совецкую моладзь!

Выхаванне ўсёй совецкай моладзі ў комуністычным духу патрабуе ад кожнай комсамольскай арганізацыі, кожнага комсамольца глыбокага пранікнення ў гушчу моладзі, усебаковага ведання быту і жыцця яе, аказання ёй дапамогі ва ўзняцці яе палітычнага і культурнага ўзроўню. Ісці на чале ўсёй совецкай моладзі, апіраецца на яе — вось задача комсамольскіх арганізацый.

X з'езд намеціў баявую праграму работы па выхаванню падрастаючага пакалення, намеціў далейшыя шляхі работы комсамолу сярод дзяцей у школе і па-за школай.

Выключныя задачы, якія пастаўлены з'ездам перад усімі арганізацыямі комсамола па палепшанню выхаваўчай работы сярод дзяцей, патрэбуюць перабудовы форм і метадаў работы ўсіх комсамольскіх арганізацый.

Работа па выхаванню падрастаючага пакалення выключна адказная і важная. Партыя, урад, асабіста таварыш **Сталін** аддаюць выхаванню дзяцей выключна вялікую ўвагу. Клопаты аб школе, велізарныя клопаты аб совецкім настаўніку — усё гэта стварае выключна спрыяючыя ўмовы для разгортвання работы комсамольскіх арганізацый сярод дзяцей.

X з'езд ленінскага комсамола з'явіўся магутнай дэманстрацыяй беззаветнай адданасці ўсяго ленінскага комсамола да ўсёй совецкай моладзі, да справы **Леніна — Сталіна**, да справы комунізма.

Ленінскі комсамол, выпеставаны і выхаваны найвялікшым геніем чалавецтва, другам і настаўнікам моладзі — вялікім **Сталіным**, — заўсёды быў, ёсць і будзе верным баявым і надзейным памочнікам нашай партыі. За справу партыі, за справу **Леніна** і **Сталіна**, за гонар і славу нашай вялікай социялістычнай радзімы самааддана змагаецца ленінскі комсамол і ўся совецкая моладзь.

І калі пры закрыцці з'езда ўся зала ў надзвычайнай радасці вітала нашу партыю, вялікага **Сталіна**, правадыр народаў, настаўнік і лепшы друг моладзі таварыш **Сталін** усклікнуў:

— **«Няхай жыве совецкая моладзь. Ура!».**

Гэтыя словы натхняюць новым магутным творчым уздымам сэрцы 37-мільённай армії дзяўчат і юнакоў нашай краіны.

У гэтых словах заключаны цельныя, бацькоўскія клопаты, бязмежная любоў правадыра да нашай совецкай моладзі, да яе далейшага росту.

Наша совецкая моладзь і яе перадавая частка—ленінскі комсамол, пад кіраўніцтвам партыі пойдзе да новых і новых перамог, да таржаства комунізма.

ТАВ. ГАЛАДЗЕД У КАЛГАСАХ КАПЫЛЬШЧЫНЫ

КАПЫЛЬ, 21 красавіка. (БЕЛТА). 20 красавіка ў Капыльскі раён прыбыў старшыня Соўнаркома БССР тав. Галадзед. Тав. Галадзед наведаў рад сельсоветаў і калгасаў раёна.

У часе гутаркі з калгаснікамі і калгаснімамі сельгасарцелі «Перамога», Быстрыцкага сельсовета, тав. Галадзед цікавіўся ходам палявых работ і скончэннем будаўніцтва калгаснай электрастанцыі. Азнаёміўшыся з веснавой сяўбой у калгасах «Памяць Леніна» і імя Молатава, Вялікараўскага сельсовета, тав. Галадзед даў рад практычных указанняў старшыням калгасаў у барацьбе за высокі ўраджай.

Тав. Галадзед асабліва цікавіўся работай трактараў. У калгасе імя Молатава для праверкі як працуе трактар «ХТЗ», тав. Галадзед сеў за руль і прайшоў некалькі баразён.

Старшыню Соўнаркома суправаджалі сакратар оргбюро ЦК КП(б)Б па Слуцкай акрузе тав. Каменштэйн і старшыня оргкамітэта ЦВК БССР па Слуцкай акрузе тав. Жолудаў.

ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС У ПОЛЬШЧЫ

ПАРЫЖ, 22 красавіка. (БЕЛТА). Газеты з напружанай увагай сочаць за развіццём палітычнага крызісу ў Польшчы.

Газета «Тан» у перадавым артыкуле ўказвае, што ў канчатковым выніку армія адыгрывае рашаючую ролю ў палітычным жыцці Польшчы і што гаспадаром становішча з'яўляецца Рыдз-Сміглы (генеральны інспектар армії).

Падкрэсліваючы рашаючую ролю Рыдз-Сміглы, «Пці журналь» піша, што «палкоўнікі, як відаць, мелі намер выклікаць крызіс у час адсутнасці кіраўніка урада (паездкі Касцялкоўскага ў Венгрыю). Падзеі ва Львове прымусілі іх выступіць заўчасна. Прэм'ер Каспялкоўскі адтэрмінаваў сваю паездку ў Будапешт з тым, каб заручыцца падтрыманнем прэзідэнта рэспублікі і генеральнага інспектара армії. Абодва, як відаць, згадзіліся падтрымаць яго».

ВАРШАВА, 22 красавіка. Газета «Экспрэс поранны» напамінае, што 10 год назад перад майскім пераваротам Пілсудскага яна перасцерагала тагочасны кааліцыйны ўрад, у склад якога ўваходзілі таксама прадстаўнікі ППС, супроць праяўлення слабасці перад тварам выступлення беспрацоўных і комуністаў. Буйным шрыфтам газета перадрукоўвае загалоўкі сваіх тагочасных артыкулаў:

«Даволі нарад, пан міністр!», «Час дзейнічаць!», «Непаваротлівасць з'яўляецца прычынай хваляванняў беспрацоўных!», «Урад моцнай рукі з'яўляецца дзяржаўнай неабходнасцю» і т. п. «Экспрэс поранны» заяўляе, што гэтыя лозунгі маюць і цяпер вялікую актуальнасць і дае зразумець «панам з ППС», што няма чаго разлічваць на паўтарэнне сітуацыі, якая была перад майскім пераваротам.

Лозунгі к 1 мая 1936 года

1. Няхай жыве 1-е мая — баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!

2. Братам па класу, афярам фашысцкага тэрору, вязням капіталізма ў дзень 1 мая — наша пролетарскае прывітанне!

3. Пролетарыі ўсіх краін! Умацоўвайце справу пролетарскага інтэрнацыяналізма! Становіцеся пад сцяг Комуністычнага Інтэрнацыянала! Наперад, да новых баёў і перамог! Няхай жыве сусветная социялістычная рэволюцыя!

4. У краінах капіталізма, у краінах фашызма мільёны рабочых і сялян асуджаны на голад, галечу і беспрацоўе. У СССР улада совецтаў знішчыла беспрацоўе, адкрыла ўсім працоўным шырокі шлях да заможнага, культурнага, радаснага жыцця. Пролетарыі і сяляне ўсяго свету! Ідзіце па шляху рабочых і сялян Совецкага Саюза! Далоў фашызм! Далоў капіталізм! Няхай жыве совецкая ўлада ва ўсім свеце!

5. Фашызм — гэта наступленне капітала на рабочы клас! Фашызм — гэта захватніцкая вайна! Фашызм — гэта голад, галеча, разарэнне! Пролетарыі і працоўныя ўсіх краін! Згуртоўвайцеся ў адзіны фронт для барацьбы супроць фашызма і вайны!

6. Ворагі міру працуюць тайна, вайна можа ўспыхнуць нечакана. Пролетарыі ўсіх краін і ўсе працоўныя! Аб'яднайцеся для барацьбы супроць падпальшчыкаў вайны! За мір, за социялізм!

7. Няхай жыве таварыш Тэльман, правадыр рабочага класа Германіі!

8. Прывітанне пролетарыям і працоўным Іспаніі, паспяхова наступаючым адзіным фронтам на фашызм і рэакцыю! Няхай жыве гераічная комуністычная партыя Іспаніі!

9. Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

10. Японскія мілітарысты не спыняюць правакацый на далёка-ўсходніх граніцах нашай радзімы! Будзем пільны! Будзем гатовы даць сакрушальны адпор правакатарам вайны!

11. Брацкае прывітанне народу Манголь скай Народнай Рэспублікі, які адстойвае свабоду і незалежнасць сваёй краіны!

12. «Ні адной пядзі чужой зямлі не хочам. Але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому» (Сталін).

13. «Мы стаім за мір і адстойваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны!» (СТАЛІН). Няхай жыве совецкая палітыка міру!

14. Няхай жыве наша родная, непераможная Чырвоная армія — магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны вартавы граніц СССР!

15. Баявое прывітанне маладым байцам Чырвонай арміі, якія прысягаюць 1 мая на вернасць совецкай уладзе, на вернасць нашай вялікай радзіме!

16. Першамайскае прывітанне байцам-пагранічнікам, пільным паставым совецкіх граніц!

17. Працоўныя СССР! Уступайце ў рады Асоавіяхіма! Авалодвайце ваеннай тэхнікай! Будзьце гатовы да стойкай абароны краіны социялізма!

18. Чырвонаармейцы і чырвонафлотцы! Будзьце меткімі стралкамі, вопытнымі артылерыстамі, бясстрашнымі лётчыкамі, мужнымі танкістамі, адважнымі падводнікамі! Множце рады стаханаўцаў Чырвонай арміі! Няхай расце і мацнее, авалодвае тэхнікай і загартоўваецца наша родная, магутная Чырвоная армія!

19. Няхай жывуць совецкія лётчыкі — гордыя соколы нашай радзімы! Моладзь, на самалёты! Вывучайце ў дасканаласці лётную тэхніку!

20. Многамільённай арміі стаханаўцаў прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадаркі, знатным людзям нашай краіны, героям социялістычнай працы — палкае большэвіцкае прывітанне!

21. Ад стаханаўскіх пяцідневак і дэкад да бесперапыннай стаханаўскай работы фабрык, заводаў, шахт, транспарту! Перавыконаем план стаханаўскага 1936 года! Створым дастатак прадуктаў і павялічым багацце совецкай краіны!

22. Зробім абучэнне тэхнічнаму мінімуму ўсеагульным і абавязковым для ўсіх рабочых і работніц! Падымем культурна-тэхнічны ўзровень рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы!

23. Камандзіры прамысловасці! Дапаможам «стаханаўцам разгарнуць далей стаханаўскі рух і распаўсюдзіць яго ўшыр і ўглыб на ўсе вобласці і раёны СССР» (СТАЛІН). Зломім супраціўленне саботажнікаў стаханаўскага руху!

24. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі! Дабіцеся асваення новых тэхнічных норм і вытворчых магутнасцей нашай социялістычнай прамысловасці! Перакрыем стаханаўскай работай новыя нормы выпрацоўкі!

25. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абарончай прамысловасці! Вы адказваеце перад краінай за абарону краіны. Будзьце гатовы выканаць з гонарам вытворчы план гэтага года і палепшыць усямерна якасць прадукцыі!

26. Рабочыя і работніцы, камандзіры і інжынеры совецкай металургіі! Дабіцеся самых перадавых у свеце паказальнікаў прадукцыйнасці нашых домен, мартэнаў і станаў. Выжмем з тэхнікі ўсё, што яна можа даць нашай радзіме!

27. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі вугольнай прамысловасці! Змагайцеся за стаханаўскую расстаноўку сіл, за стаханаўскія мэтады работы! Падымайце прадукцыйнасць урубавых машын, адбойных малаткоў, электравозаў! Раўняйцеся на перадавых стаханаўцаў!

28. Стаханаўцы нафтавай прамысловасці! Пакончым з адставаннем нафтавай прамысловасці! Змагайцеся за самую высокую ў свеце хуткасць праходкі нафтавых скважын, поўную бездаварыйнасць і лепшую ў свеце эксплаатацыю кожнай скважыны!

29. Рабочыя, работніцы, інжынеры і тэхнікі нафтаперапрацоўчай прамысловасці! Больш першакласнага апалу совецкім маторам! Змагайцеся за самы высокі выхад светлых прадуктаў — газы, лігроіну, бензіну!

30. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі хімічнай прамысловасці! Дайце краіне больш прадукцыі, выконвайце і перавыконвайце вытворчы план хімічнай прамысловасці!

31. Першамайскае прывітанне рабочым і работніцам, камандзірам, інжынерам і палітработнікам чыгуначнага транспарту, ператвараючым транспарт у перадавую галіну народнай гаспадаркі нашай краіны. За 90 тыс. вагонаў пагрузкі ў суткі! За ўзорны пасажырскі рух, достойны краіны социялізма! Няхай жывуць стаханаўцы, крыванасоўцы, перадавыя людзі чыгуначнага транспарту!

32. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лесазагатовак і лясной прамысловасці! Авалодвайце механізацыяй работ! Забяспечце ўзорнае правядзенне сплаву, поўнае і своечасовае снабжэнне будаўніцтваў і прамысловасці лесаматэрыяламі!

33. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі папяровых фабрык і цэлюлозных заводаў! Шырокім разгортваннем стаханаўска-пронінскіх метадаў работы выводзьце папяровую прамысловасць у рады перадавых галін социялістычнага будаўніцтва! Дайце краіне больш паперы высокай якасці!

34. Работнікі харчовай прамысловасці! Замацуйце і развівайце свае поспехі, будзьце перадавымі барацьбітамі за перавыкананне плана 1936 года! За высокую культуру работы і санітарыю на харчовых прадпрыемствах, за багацце першакласных харчовых прадуктаў!

35. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лёгкай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, трыкатажу, абутку для грамадзян совецкай краіны! Змагайцеся за паляпшэнне якасці, за багаты асартымент! Памнажайце рады стаханаўцаў-вінаградаўцаў!

36. Калгаснікі і калгасніцы, аграномы і работнікі соўгасаў! Змагайцеся за вытворчасць 7—8 млрд. пудоў зярна ў год! Падымайце ўраджай социялістычных палёў!

37. Першамайскае прывітанне пяцісотніцам бурачных палёў!

38. Няхай жывуць стаханаўцы і стаханаўкі баваўняных палёў! Дамо краіне 40 мільёнаў пудоў бавоўны!

39. Няхай жывуць знатныя людзі калгаснага сяла — трактарыюты і трактарысткі, камбайнеры і камбайнеркі, брыгадзіры і звеннявыя, старшыні і старшыньшы калгасаў!

40. Прывітанне стаханаўцам социялістычных палёў, па-большэвіцку выконваючым план веснавой сяўбы! Узорнай, ударнай работай даб'емся высокіх ураджаяў!

41. Рабочыя і работніцы соўгасаў! Зробім кожны соўгас вядучым прадпрыемствам социялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі! Ператворым соўгасы ў рассадніні лепшых племянных парод жывёлы! За безубытачную работу ўсіх соўгасаў!

42. Ні аднаго калгаса без жывёлагадоўчай таварнай фермы! Калгаснікі і калгасніцы! Даб'емся высокіх удояў, добрага нагулу і паляпшэння пароды жывёлы, беражлівага вырошчвання маладняка! За ўздым социялістычнай жывёлагадоўлі!

43. Няхай жыве саюз рабочых і сялян супроць усіх ворагаў социялізма, унутраных і знешніх!

44. Шырэй разгорнем совецкі культурны гандаль у горадзе і вёсцы! Зробім совецкі гандаль дастойным нашай социялістычнай дзяржавы!

45. Работнікі і работніцы совецкіх магазінаў! Змагайцеся за чэснае і культурнае задаваленне запатрабаванняў совецкіх грамадзян!

46. Социялізм азначае ліквідацыю жыллёвай нужды і цеснаты! Жыллёвае будаўніцтва павінна стаць перадавым участкам нашай будаўнічай работы!

47. Захоўвайце, як зяніцу вока, ад рвачоў, зладзеяў і лодыраў грамадскую социялістычную ўласнасць — аснову совецкага ладу!

48. Няхай жыве брацкі саюз і дружба народаў СССР, якія пабеданосна будуюць социялізм і ўмацоўваюць абарону вялікай социялістычнай радзімы!

49. Узмоцнім праверку выканання дырэктыў партыі і ўрада! Мацней агонь самакрытыкі супроць бюракратычных яваў і недахопаў апарата!

50. Працоўныя краіны Совецтаў! Азлобленыя паследні паміраючага класавага ворага прабуюць напакасціць нашай радзіме. Вынаранім паследкаў буржуазіі! Далоў благадушнасць і ратазейства! Будзем заўсёды і ўсюды пільнымі!

51. Прывітанне работнікам навукі і тэхнікі, мастацтва і літаратуры, умацоўваючым тэхнічную і культурную магутнасць социялістычнай радзімы! Няхай жыве росквіт культуры народаў СССР!

52. Пабеданосным социялістычным будаўніцтвам знішчана асноваекавечнага прыгнечання жанчыны. Няхай жыве роўнапраўная працоўная жанчына! Няхай жыве ўзрастаючая грамадская і вытворчая актыўнасць працоўных жанчын! За вылучэнне гераінь — стаханавак фабрык і заводаў, калгасных і соўгасных палёў на кіруючыя пасты!

53. Больш клопатаў аб здароўі працоўных! Больш увагі справе совецкай аховы здароўя! Вынаранім бюракратызм і бездаказнасць у лекавых установах і органах аховы здароўя! За ўзорную работу нашых больніц, санаторый, клінік!

54. Няхай жывуць совецкія фізкультурнікі — гордасць нашай краіны! За здаровае жыццерадаснае пакаленне, гатовае да працы і абароны социялістычнай радзімы! За высокае майстэрства совецкіх фізкультурнікаў! За новыя перамогі совецкага спорту!

55. Забяспечым выхаванне рабоча-сялянскай моладзі ў духу комунізма. Няхай жыве комсамольскае племя — магутны рэзерв і надзейны памочнік большэвіцкай партыі! Няхай жыве працоўная моладзь Совецкага Саюза!

56. Совецкаму народнаму настаўніку, які абучае і выхоўвае маладое пакаленне Саюза ССР, першамайскае прывітанне!

57. Піонеры і школьнікі! Авалодвайце асновамі навук, умацоўвайце дысцыпліну ў школе! Будзьце гатовы прадаўжаць і завяршыць вялікую справу Леніна! Няхай жывуць нашы совецкія дзеці!

58. Рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы, усе працоўныя Совецкага Саюза! Цясней згуртуем рады вакол партыі Леніна! Наперад на барацьбу за генеральную лінію партыі! Наперад за перамогу комунізма!

59. Няхай жыве Усесаюзная комуністычная партыя большэвікоў — правадыр і арганізатар пабеданоснага будаўніцтва социялізма!

60. Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна! Няхай жыве ленінізм!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў).

Аб фактах процідзеяння стаханаўскаму руху ў соўгасе Горкі-Абчак, Менскага раёна

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Праверкай устаноўлена, што ў соўгасе «Горкі-Абчак», Менскага раёна ў адносінах стаханаўкі-свінаркі т. Жалудка дапушчана з боку бухгалтэрыі соўгаса сістэматычнае аблічванне і затрыманне зарплаты; на працягу некалькіх месяцаў т. Жалудка не прадастаўлялася кватэра, абяцаная ёй яшчэ ў 1935 годзе дырэкцыяй; у дні адпачынку т. Жалудка прымаванае да яе чагалоўе было накормлена па распараджэнню брыгадзіра Гутарчыка і зоатэхніка Ісаенка заведама нядобраякаснымі кармамі, у рэзультаце чаго ўсё пагалоўе парасят захварэла.

Палітаддзел соўгаса і дырэкцыя замест таго, каб усяляк падтрымаць т. Жалудка ў яе ўдарнай рабоце, яе вопыт перадаць іншым брыгадам, абмежаваліся тым, што абвясцілі т. Жалудка стаханаўкай, а потым аб ёй забылі, няспечасова рэагуючы на здзекі з боку прахадзімцаў і жулікаў над тав. Жалудка.

Агульнае нездавальняючае становішча соўгаса безумоўна сведчыць аб зусім нездавальняючай рабоце як дырэктара, так і начальніка палітаддзела соўгаса, якія да сённяшняга дня не зразумелі ўсёй палітычнай важнасці прасоўвання, штодзеннага падтрымання і ўвагі да лепшых перадавых работнікаў соўгаса, што пацвярджаецца не толькі справай т. Жалудка, але і іншых ударнік і ўдарнікаў соўгаса, як тт. Крывіцкай, Матусевіч, Яноўскай і інш., якія прадастаўлены самім сабе і не атрымліваюць падтрымання ў сваёй рабоце.

ЦК папярэджвае дырэктара соўгаса т. Цеперука і начальніка палітаддзела т. Масевіча, што, калі ў бліжэйшы час яны не выправяць усе выяўленыя факты процідзеяння стаханаўскай рабоце т. Жалудка і становішча справы ў соўгасе, ЦК прыме да іх больш сур'ёзныя меры спагнання.

Прыняць да ведама заяву тав. Масевіча, што зоатэхнік Ісаенка і брыгадзір Гутарчык зняты з работы і адданы пад суд.

ЦК абавязвае начальніка палітаддзела т. Масевіча і дырэктара соўгаса, апіраючыся на ўжо дасягнутыя рэзультаты работы перадавых людзей соўгаса — тт. Жалудка, Крывіцкай, Кароткай, Матусевіч і іншых — зрабіць іх апорай у сваёй рабоце па барацьбе з недысцыплінаванасцю і дробнабуржуазнай расхлябанасцю сярод адміністрацыйнага персаналу і асобных рабочых у барацьбе за разгортванне стаханаўскага руху ў соўгасе.

ПК прапануе перагледзець заключаныя дагаворы на соцспаборніцтва, як фармальна бюракратычныя, скажаючыя сутнасць соцыялістычнага спаборніцтва, і заключыць новыя канкрэтныя абавязацельствы для брыгады і асобных рабочых, сістэматычна правяраючы іх выкананне.

ЦК патрабуе ад усіх дырэктароў і начальнікаў палітаддзелаў соўгасаў і соўгасных партарганізацый бязлітаснай і сістэматычнай барацьбы супроць саботажнікаў стаханаўскага руху, супроць кампанійскіх адносін да стаханаўскага руху і социялістычнага спаборніцтва. Партарганізацыі соўгасаў павінны ўзначаліць стаханаўскі рух і штодзенна ім кіраваць, дапамагаючы стаханаўцам у правядзенні і выкананні ўзятых імі на сябе абавязацельстваў у іх вялікай рабоце па перадачы свайго вопыту іншым.

ВОПЫТ ЛЕПШЫХ — УСІМ ТРАКТАРНЫМ БРЫГАДАМ

ДАМ СЁЛЕТА 1.300 ГЕКТАРАЎ

ТРАКТАРЫСТ АЛАДКА АБ СВАЕЙ РАБОЦЕ

Супрацоўнік рэдакцыі «Звязды» ўчора па тэлефону меў гутарку з трактарыстам Старобінскай МТС тав. Аладка, які на трактарнай сеялцы 20 красавіка засеяў 32 гектары.

Тав. **Аладка** аб сабе расказаў наступнае.—Спаборнічаю з двума трактарыстамі: **Барановскім Якубам** па ворыву і з **Пятровічам** па сяўбе. Рэзультаты спаборніцтва з Барановскім Якубам пакуль яшчэ невядомы. А вось **Пятровіч** сёння дасягнуў маёй нормы выпрацоўкі. Ён таксама на трактарнай сеялцы засеяў 32 гектары. Думаю, што пяршынства ў спаборніцтве застанецца за мной.

— Колькі вы за гэты дзень зарабілі і ў якіх умовах працуеце?

За 20 красавіка я зарабіў 32 руб. грашыма і 13 працадзён. Жыву са сваім памочнікам **Дубовікам** у старшыні калгаса. Кватэра вельмі добрая. Чыста, утульна. Мне на поле прывозяць снеданне і абед. Адным словам, няма чаго скардзіцца. Забяспечваюць добра. Прывозяць газеты, кніжкі. Зараз я са сваім памочнікам чытаю кнігу «Як гартавалася сталь» Остроўскага. Да мяне вельмі часта прыязджаюць сакратар райкома **Баярчанка** і дырэктар МТС тав. **Казлоў**. Цікавяцца як я жыву і працую. На вытворчых нарадах абменьваемся вопытам работы.

У канцы гутаркі тав. **Аладка** пазведаміў рэдакцыі, што ён ставіць перад сабою мэту — даць на сваім трактары 1.300 гектараў.

АДЗІНАЦЦАЦЬ З ПАЛОВАЙ ГЕКТАРАЎ ЗА ЗМЕНУ

ЛЮБАНЬ. Прымяняючы стаханаўскія метады работы, трактарысты Любаньскай МТС тт. **Януш Вольга**, **Вароніч** і **Скрыган** за змену замест чатырох узорваюць 11,5 гектара. Якасць работы добрая.

КУРКЕВІЧ.

10 ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАРЫ «ХТЗ»

ХОЦІМСК. Трактарыст т. **Чубукоў**, з брыгады т. **Чэчыка**, за 20 і 21 красавіка ўзараў на трактары «ХТЗ» 20 гектараў. Якасць работы прызнана выдатнай.

Д. ЛЕБЕДЗЕЎ.

Да адказнасці за злоснае парушэнне агратэхнікі

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА Паасобныя калгасы распачалі сяўбу яшчэ 3—4 красавіка. 13—14 красавіка выйшлі сеяць усе калгасы раёна. Ёсць сельсоветы, якія выканалі план сяўбы на 25 і больш проц. Аднак, у паасобных сельсоветах сяўба разгортваецца вельмі марудна. З першых-жа дзён выяўлен рад фактаў парушэння агратэхнікі.

Характэрным у гэтай справе з'яўляецца калгас «Рассвет», Жыліхаўскага сельсовета. Тут глебу падрыхтавалі, не прытрымліваючыся ніякіх правіл агратэхнікі. Старшыня калгаса Корзун (кандыдат партыі) даў брыгадзірам устаноўку: сеяць як найхутчэй, не зварачаючы ўвагі на якасць. У выніку, па зусім няўгноенай глебе ў аднавор пасеялі 13 гектараў аўса. Бульбу таксама пачалі садзіць у аднавор.

Ва многіх калгасах не скарыстоўваюцца радковыя сеялкі. Напрыклад, у калгасе «Шлях Леніна», Жыванлодаўскага сельсовета, сеюць авёс ручным спосабам, а сеялкі стаяць пад навесам. Ручным спосабам сеюць і ў калгасе «Большэвік», сеялка не выкарыстоўваецца, яна да гэтага часу яшчэ стаіць неадрамантаванай.

Засеяныя ўчасткі не прымаюцца ні інспектарамі па якасці, ні старшынямі калгасаў. Вось, напрыклад, у калгасе «Шлях Леніна» пасеялі 9 гектараў аўса, старшыня калгаса Бань нават на поле не пайшоў, не ведае, як запраўлена насенне. Аграномы мала дапамагаюць перадавым людзям у барацьбе за ўраджай. Напрыклад, брыгадзір перадавой у раёне брыгады з калгаса «3-ці рашаючы» — удзельнік усебеларскай нарады перадавікоў, ураджайнасці тав. Плявака Васіль хацеў даведацца, як лепш унесці мінеральнае ўгнаенне пад лён. Але звярнуцца за парадамі няма да каго. Аграномы-ж Чырвонаслабодскага раёна сядзяць у канцэлярыі і складаюць розныя зводкі.

Кіраўнікі раёна сустракалі прыехаўшага з Менска брыгадзіра Плявака Васіля прывітаннямі, давалі абяцанні.

— Будзь упэўнен, таварыш Плявака... Усё будзе зроблена. Твая брыгада ўзятыя самаабавязацельствы выканае. Мы табе заўсёды дапаможам.

Так гаварылі загадчык райза Балабуткін, дырэктар машынна-трактарнай станцыі Петрусевіч. Так гаварылі і ў райкоме, і ў райвыканкоме. Але ўсё гэта застаецца пакуль пустой балбатнёй. Перадавая брыгада Плявакі застаецца па-за ўвагай раённых партыйных і совецкіх арганізацый.

Г. СКУЦЭНЯ.

X Усесаюзны з'езд ленінскага комсамола

Заключнае слова таварыша КОСАРЭВА па справаздачнаму дакладу аб рабоце ЦК ВЛКСМ

Таварышы, мы згодны з крытыкай работы Цэнтральнага Камітэта комсамола. Гэту крытыку неабходна і можна было ўзмацніць.

Многія таварышы больш спыняліся на дасягнутых поспехах і ў меншай меры—на наяўных недахопах. У асобных таварышоў яўна не хапала скромнасці, калі гутарка ішла аб ацэнцы нашых дасягненняў. Аб дасягненнях гаварыць прыемна, але залішне гаварыць аб іх, а тым больш іх пераацэньваць — справа сугуба шкодная.

Некаторыя таварышы згаджаліся з дакладам ЦК, але чамусьці не палічылі неабходным уступіць у дзелавое абмеркаванне яго важнейшых палажэнняў.

Скажам, як у далейшым арганізаваць вучобу моладзі, выходзячы з мясцовых умоў; як лепш расставіць наяўныя сілы і прыцягнуць новыя; як узняць узровень актыва для рашэння задач вучобы, асветы і выхавання мас моладзі, — усе гэтыя пытанні не былі ў дастатковай меры ўзяты пад абмеркаванне з боку некаторых выступаўшых таварышоў.

У дакладзе высунута палажэнне аб неабходнасці паднясці кіраўніцтва комсамола на ўзровень задач адукацыі і выхавання моладзі. Гэта палажэнне, з'яўляючыся адным з асноўных у далейшай перабудове ўсяго комсамола, не было, як след, абмеркавана асобнымі таварышамі, выступаўшымі ў спрэчках.

Мы сустрэнемся з яўным нежаданнем асобных таварышоў выконваць рашэнні з'езда аб выхаванні і асвеце моладзі. На наш погляд, падаснова такога нежадання заключаецца ў шкодным заблуджэнні іншых таварышоў, упэўненых у тым, що, займаючыся гаспадарчай работай, яны, напэўна, даб'юцца заахвочання. А вось станеш — думаюць яны — займацца сярэдняй школай, ніхто і не заўважыць пябе, ніхто, моў, заахвочваць гэта і не будзе.

Абсалютна няверны пункт гледжання! Усё, што будзе зроблена добрага, карыснага ў імя ўзьдыму культуры моладзі і яе асветы і выхавання, — усё гэта атрымае самае жывое падтрыманне ў нашай партыі.

Мы сустрэнемся з нежаданнем у некаторых арганізацый займацца асветай і выхаваннем моладзі і з той прычыны, што ў нас больш вопыту ўдзелу ў гаспадарчай рабоце, чым вопыту культурнай, асветнай работы. І вось тэму некаторыя стануць на шлях найменшага супраціўлення, пойдуць па старой, знаёмай, зведанай дарожцы, будуць рабіць тое, што ўжо прывычна.

Мы павінны такія спробы перамагаць з усёй бязлітаснасцю і ўсе нашы арганізацыі, увесь наш актыў рашуча накіроўваць на шлях арганізацыі абучэння і выхавання нашай моладзі.

У дакладзе ЦК ВЛКСМ многа ўвагі ўдзелена метадам выхавання моладзі, а некаторыя, нам здаецца, не хочуць задумацца і над гэтым рашаючым пытаннем ідэйна-палітычнага і культурнага фармавання маладога чалавека нашай краіны.

Сіла асабістага прыкладу актыва вырашае справу асветы і выхавання моладзі. Як ні сумна, але часам у нас выходзіць так, што чым большае кіруючае палажэнне займаюць іншыя таварышы ў нашых арганізацыях, тым часцей мы наглядаем сярод іх неарганізаванасць, расхлябанасць, недыспыплінаванасць, а часамі і няграматнасць.

У выхаванні моладзі дробязей не бывае. Выхоўваць моладзь — гэта вам не з прамовамі выступаць, «увогуле і ў цэлым, у асноўным правільна».

Мы павінны патрэбаваць ад нашага актыва, каб ён паказаў сілу асабістага прыкладу правільных паводзін, дысцыплінаванасці і арганізаванасці. Калі гэтага іншыя таварышы не зробяць, то незалежна ад іх палажэння ў нашым саюзе Цэнтральны Камітэт будзе вымушэн стаць на вельмі суровы шлях — на шлях замены гэтых таварышоў, як непрыгодных і нядольных працаваць у новых умовах. (Апладысменты).

У нас ёсць людзі, якія хварэюць на верхагляцтва і не хочуць думаць над работай. Для іх склад праект якога-небудзь «адказнага» рашэння — справа найбольш спадручная. Сядуць за стол, за 5 мінут напішуць праект рашэння і лічаць, што ён не падлягае крытыцы і павінен быць прынят, і не толькі ў асноўным, а цалкам і поўнасцю. (Смех).

Я вельмі шкадую, што некаторыя сакратары абкомаў не прымалі ўдзелу ў рабоце над праектам новай праграмы, а то-б яны навучыліся, як трэба над дакументамі працаваць. (Смех. Апладысменты).

Існуе небяспека, што практычную работу па перабудове комсамола некаторыя таварышы пастараюцца ўтапіць у апладысментах, у авацыях, у прывітаннях і дадатковых рэзалюцыях. Я асабліва зварачаю ўвагу з'езда на гэту акалічнасць.

Цэнтральны Камітэт комсамола не патрабуе ні ад каго з вас ні адной дадатковай рэзалюцыі да рашэнняў з'езда. Мала таго, што не патрэбуе, а забароніць іх пісаць і выносіць. (Апладысменты). Таму мы загадзя вызваляем вас ад гэтай работы. (Апладысменты). Але мы абавязваем вас заняцца пярвічнай арганізацыяй, перабудаваць усю яе работу ў духу рашэнняў нашага з'езда.

Мы думаем пасля сканчэння работы з'езда ўсіх кіруючых работнікаў Цэнтральнага Камітэта паслаць на месцы дапамагчы вам арганізаваць выкананне рашэнняў з'езда. Сход актыва правесці — справа не хітрая і не трудная. Не для гэтага мы пашлем таварышоў, а мы пашлем арганізоўваць практычную работу па выкананню рашэнняў з'езда на мясцах. (Апладысменты).

Нам трэба перагледзець усю сваю дзейнасць, змяніць работу пярвічных арганізацый і нашага актыва, выходзячы з задач асветы і выхавання моладзі. Калі гэтага мы не зробім, значыць, мы нічога не зробім.

Нам трэба пакончыць з асобнымі элементамі аліпуйшчыны, якія, на жаль, у нас сям-там ёсць. Ніхто ад вас не патрабуе, каб да рэчы і не да рэчы вы кляліся існуючымі ці будучымі рашэннямі. Каму гэта патрабна? Нікому гэта не патрэбна!

Вопыт пераконвае, што часам рашэннямі клянуцца для таго, каб іх не выконваць.

Элементы своеасаблівай аліпуйшчыны ў нас у наяўнасці. У кожнай мясцовай арганізацыі знойдуцца такія ўслужлівыя аратары, якія справу, работу, неабходную крытыку так і нароваць падмяніць ушанаваннем, часам незаслужаным, сваіх комсамольскіх кіраўнікоў, выслаўленнем іх доблесцей і заслуг.

Калі не спыніць гэту моду, якая ўстанаўляецца ў некаторых нашых арганізацыях, то гэтым арганізацыям пагражае небяспека безмяцежнай самаўлюбёнасці, пры якой не можа быць большэвіцкай работы, большэвіцкай самакрытыкі.

Якія ўжо тут крытыка, калі ледзь не кожны аратар лічыць сваім абавязкам заявіць: «Пад кіраўніцтвам нашага баявога сакратара», «пры яго непасрэднай асабістай дапамозе», «дзякуючы яго асабістаму ўмяшанню» і т. д. і т. д. Нікуды гэта не годна. Не дзеланіта гэта гучыць. (Апладысменты).

Нельга сказаць, што ў нашым асяроддзі няма такіх людзей, якія за падобнымі славеснымі практыкаваннямі забываюць аб галоўным — аб рабоце. (Апладысменты).

Можа быць, гэта робіцца для таго, каб падтрымаць сваё кіраўніцтва? Дзякуй, таварышы, за такі добры намер. (Смех, апладысменты). Падтрымлівайце сваё кіраўніцтва так, як мы вас падтрымліваем (смех, апладысменты), г. зн. вострай большэвіцкай крытыкай. (Галасы: Правільна).

Калі вы прыязджаеце ў ЦК, тут вам прыемных слоў не гаворань. Калі ласка, не гаварыце і вы нам такіх слоў. Калі хочаце нас падтрымаць, будзьце да нас аб'ектыўны. За добрае—заахвочвайце, за дрэннае — крытыкуйце.

Каму мы абавязаны нашымі поспехамі?

Кіраўніцтву Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі.

Не прынісвайце поспехаў работы толькі сваім асабістым якасцям. Асабістыя якасці кіраўніка—гэта адна з умоў перамогі, але канчаткова вырашаюць перамогу якасці кіруючага калектыва і правільнае кіраўніцтва гэтым калектывам.

Партыйнае кіраўніцтва ёсць абавязковая ўмова, без якой мы не можам паспяхова ісці наперад. (Бурныя апладысменты).

Самае шкоднае для нас, таварышы, гэта самаўлюбёнасць, пераацэнка саміх сябе. Поспехі комсамола ёсць рэзультат партыйнага выхавання нашага актыва, рэзультат работы ўсяго калектыва.

Я заклікаю з'езд, увесь актыў ленінскага комсамола змятаць на сваім шляху ўсё гнілое, надуманае, ненатуральнае ў нашай рабоце. Я заклікаю па-баявому прывесці ў большэвіцкую арганізаванасць рады ўсіх звенняў комсамольскага актыва і па-большэвіцку рынуцца на выкананне новых задач. Мы іх, таварышы, выкананем, бо гэтага ад нас патрабуе ЦК ВКП(б), гэтага чакае ад нас таварыш Сталін. (Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты. Усе ўстаюць. З усіх канцоў залы нясуцца прывітальныя воклічы на розных мовах у гонар таварыша Сталіна, у гонар ЦК ВКП(б)).

Справаздача дэлегацыі ВЛКСМ у Выканкоме Комінтэрна моладзі

З даклада таварыша ЧЭМАДАНАВА

ТРАГЕДЫЯ МАЛАДОГА ПАКАЛЕННЯ

У краіне перамогшага соцыялізма няма ні капіталістаў, ні эксплаатуемых. У краіне перамогшага соцыялізма моладзь — шчаслівая і свабодная — сама будуе сваё жыццё, не баючыся страшных праблем аб «бацьках і дзецях», аб «заўтрашнім дні». Зусім іншае становішча ў краінах капіталізма. Цэлае пакаленне — уся моладзь капіталістычных краін — перажывае трагедыю безвыходнасці, пакутлівых клопатаў аб заўтрашнім дні, бяспраўя і прыгнечанасці. Аб гэтай трагедыі маладога пакалення капіталістычных краін гаварыў у сваім дакладзе тав. Чэмаданаў (ВК КІМ), выступаўшы на X з'ездзе комсамола са справаздачай дэлегацыі ВЛКСМ у Выканкоме Комуністычнага інтэрнацыянала моладзі.

Ён гаварыў аб рабскай ідэалогіі, у якой выхоўвае моладзь буржуазія, аб майстэрстве адурманьвання мас у школе, у царкве, у літаратуры, мастацтве, прыкрываючымся напышлівымі фразамі аб «індывідуальнай свабодзе» і «дэмакратыі».

Бічом маладога пакалення ў капіталістычных краінах з'яўляецца беспрацоўе. Па даных міжнароднага бюро працы ў капіталістычных краінах зарэгістравана 6—7 мільёнаў беспрацоўнай моладзі. А колькі яшчэ мільёнаў незарэгістраванай беспрацоўнай моладзі?

У крыху лепшых умовах знаходзіцца тая моладзь, якой выпала на долю шчасце знайсці работу. Але і яна жыве пад пастаяннай пагрозай звальнення. Прадпрыемцы, будучы ўпэўненымі ў тым, што на «рынку» працы ёсць лішак рабочай сілы, бязлітасна эксплаатуюць рабочых і моладзь, праследуюць яе штрафамі і жорстка распраўляюцца з непакорнымі. У яшчэ больш жудасных умовах знаходзіцца працоўная моладзь каланіяльных і поўкаланіяльных краін.

— Вядома, — гаворыць тав. Чэмаданаў,—найглыбейшы эканамічны крызіс не мог прайсці бясследна ў свядомасці моладзі капіталістычных краін. Тым больш, калі яна ведае, што на адной шостай зямнога шара ёсць другі свет, дзе моладзь не ведае жахаў беспрацоўя, эксплаатацыі і галечы.

Моладзь пачынае сваю «пераацэнку каштоўнасцей». У яе радах расце незадаваленне. Бачачы гэта незадаваленне, буржуазія перабудоўвае свае формы барацьбы за моладзь і імкнецца накіраваць яе актыўнасць у рэчышча рэакцыі.

ФАШЫЗМ — ЗЛЕЙШЫ ВОРАГ МОЛАДЗІ

Фашызм абяцае сябе «партыяй моладзі». Пры дапамозе фашызма буржуазія прабуе выхоўваць моладзь у духу пакорнасці, неабходным для таго, каб падрыхтаваць кадры для новай імперыялістычнай вайны. Якім чынам яму ўдалося, напрыклад, у Германіі павесці за сабой вядомыя слаі моладзі?

Таварыш Дзімітраў на VII кангрэсе Комінтэрна ўказваў: «Фашызм улавіў асабліва вострую ў моладзі патрэбнасць у баявой актыўнасці і ўпягнуў значную частку яе ў свае баявыя атрады. Новае пакаленне мужчынскай і жаночай моладзі не прайшло праз жудасці вайны. Яно адчувае на сваіх плячах увесь цяжар эканамічнага крызісу, беспрацоўя і распаду буржуазнай дэмакратыі. Не бачачы перспектыў на будучае, значныя слаі моладзі аказаліся асабліва ўспрыймальнымі да фашысцкай дэмагогіі, пысаваўшай ім прывабную будучыню пры перамозе фашызма».

Тав. Чэмаданаў радам прыкладаў паказвае характар і формы гэтай фашысцкай дэмагогіі, выкрывае яе парочнасць.

Тав. Чэмаданаў асабліва спыняецца на трагедыі, якую перажывае зараз нямецкая моладзь.

— Фашызм абяцаў моладзі соцыялізм, — гаворыць ён, — ён даў ёй казарму. Ён закаваў яе ў сярэдневяковыя ланцугі рабства.

— Законы аб звальненні з вытворчасці ўсёй моладзі да 25-гадовага ўзросту, аб пагалоўнай вайсковай павіннасці, муштры і голад у лагерах прымусовай працы, пасылка гарадской моладзі ў якасці бясплатных батракоў на вёску, пазбаўленне жанчын усіх правоў, смяротныя кары і зверскі тэрор не могуць не выклікаць у моладзі расчаравання ў нацыянал-соцыялізме. Тым больш небяспечнымі становяцца для фашысцкай дыктатуры тыя, хто сапраўды афіруе сваім жыццём у імя інтэрэсаў працоўнага народу, у імя соцыялізма.

Вядома, што фашысцкая дыктатура не ёсць толькі адзнака сілы буржуазіі, а ёсць таксама паказальнік яе слабасці. Але рост унутраных супярэчнасцей штурхае фашызм на шлях авантурыстычных выступленняў на міжнароднай арэне.

— Вайна ці мір? — пытаецца тав. Чэмаданаў. — Гэта пытанне сёння хвалюе народы ўсіх краін, бо ёсць у наяўнасці, як вы ведаеце, два ачагі небяспекі: «першы ачаг, — як гаворыць таварыш Сталін, — знаходзіцца на Далёкім Усходзе, у зоне Японіі... Другі ачаг знаходзіцца ў зоне Германіі. Цяжка сказаць, які ачаг з'яўляецца найбольш пагражаючым, але абодва яны існуюць і дзейнічаюць».

Пад апладысменты ўсёй залы тав. Чэмаданаў гаворыць аб тым, што краіна перамогшага соцыялізма з'яўляецца ачагом міру. Да яго імкнуцца ўсе тыя, каму дарагі культура, прагрэс і свабода чалавецтва.

— І мы павінны, таварышы, сказаць, — заканчвае тав. Чэмаданаў гэту частку даклада, — слава нашай большэвіцкай партыі і совецкаму ўраду, слава вялікаму правадыру народаў Сталіну за шчаслівае, свабоднае жыццё, за мудрую палітыку міру, за выхаванне нашага маладога пакалення ў духу свабоды, прагрэсу і культуры, у духу вялікага брацтва і роўнасці народаў.

КОМУНІСТЫЧНЫ ЮНАЦКІ РУХ У КРАІНАХ КАПІТАЛІЗМА

Пасля дзесяцімінутнага перапынку тав. Чэмаданаў пераходзіць да аналізу развіцця міжнароднага комуністычнага юнацкага руху ў капіталістычных краінах. Ён падкрэслівае, што гэты рух развіваецца ў іншых умовах, чым ленінскі комсамол. Комуністычныя юнацкія арганізацыі ва ўмовах панавання буржуазіі закліканы арганізоўваць і выхоўваць, а таксама адстойваць і абараняць правы і інтарэсы працоўнай моладзі. Складанасць гэтых задач усугубляецца тым, што расце небяспека фашызма і імперыялістычнай вайны, а разам з гэтым узмацняюцца тэрор і праследванні.

Ленінскі комсамол заўсёды ўважліва сачыў і глыбока цікавіўся тым, як у капіталістычных умовах змагаецца і развіваецца юнацкі рэвалюцыйны рух. Гэты інтарэс і ўвага абумоўліваюцца тым, што «Інтэрнацыяналізм з'яўляецца асноўнай ідэяй, прасякаючай работу комсамола». (Сталін).

Комуністычны Інтэрнацыянал моладзі, які ўтварыўся пры бліжэйшым удзеле і падтрыманні цайвялікшага генія рэвалюцыі — Леніна, вырас у жорсткай класавай барацьбе ў несакрушальнае інтэрнацыянальнае аб'яднанне рэвалюцыйнай моладзі. Асобныя баявыя атрады КІМ у Германіі, Кітаі, Італіі, Японіі, Польшчы, Югаславіі, Балгарыі і ў іншых краінах не раз падпадалі самым жорсткім праследванням і вытрымлівалі тэрарыстычныя атакі азвярэлай рэакцыі.

Не раз таксама і ў саміх атрадах КІМ апартуністы ўсіх масцей і адценняў (Вуйовіч, Шашкін, Барбе-Селор, Нейман і іншыя) прабавалі дэзарыентаваць, іх у класавай барацьбе і сцягнуць у капітуляцкае апартуністычнае балота.

Апартуністычныя спробы немінуча заканчваліся крахам, бо КІМ няўхільна кіраваўся вялікім вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна і моцна стаяў на пазіцыі непрымірымай класавай барацьбы.

— Іменна таму, — заяўляе тав. Чэмаданаў пад апладысменты ўсяго з'езда, — КІМ з'яўляецца зараз адзіным у свеце ідэалагічна і арганізацыйна згуртаваным інтэрнацыянальным аб'яднаннем рэвалюцыйнай моладзі.

Тав. Чэмаданаў спыняецца далей на сектанцкіх, лявацкіх памылках, якія былі галоўнай перашкодай на шляху да ператварэння комсамолаў зарубежных краін у масавыя арганізацыі.

У асяроддзі комуністычнай моладзі ў мінулым было шырока распаўсюджана палітычна памылковае ўяўленне аб комсамоле, як аб «комуністычнай партыі моладзі». Комсамолы прабавалі пасектанцку капіраваць і нават падмяняць сабою змест, формы і метады работы компартыі.

Доўгі час дзеячы КІМ не бачылі розніцы паміж рэакцыйнымі правадырамі соцыял-дэмакратыі і шырокімі масамі соцыялістычнай моладзі. Нярэдка комсамолы разглядалі моладзь, якая знаходзілася ў масавых арганізацыях, створаных буржуазіяй, як «працоўнікаў», што азначала на практыцы самаізаляцыю ад мас моладзі. Гэта ператварала комсамол у замкнутую секту «абраных», якія адмовіліся ад упартай і цярплівай работы па арганізацыі і выхаванню шырокіх мас моладзі.

Тав. Чэмаданаў расказвае аб тым, як гэтыя слабасці і памылкі міжнароднага юнацкага рэвалюцыйнага руху былі ўскрыты большэвіцкай крытыкай таварыша Дзімітрава на VII сусветным кангрэсе Комінтэрна і якія вывады зрабіў з іх VI кангрэс КІМ.

VI кангрэс КІМ заклікаў комуністычныя саюзы моладзі капіталістычных краін пачаць на практыцы самую настойлівую барацьбу супроць самадавольнага сектанцтва, ізаляючага іх ад шырокіх мас моладзі. Ён патрабаваў ад комсамолаў карэннай перабудовы, поўнага адмаўлення ад усякага сектанцкага капіравання партыі, ператварэння саюза моладзі ў масавыя беспартыйныя юнацкія арганізацыі, задавальняючыя ўсе здаровыя запросы моладзі, абараняючыя інтарэсы і правы моладзі і выхоўваючыя сваіх членаў у духу марксізма-ленінізма.

Пасля кангрэса ва ўсіх краінах свету, у масавых некомуністычных юнацкіх арганізацыях разгарнуліся дыскусіі аб адносінах да яго рашэнняў. Асабліва вострыя характар гэтыя дыскусіі носяць у соцыялістычных арганізацыях моладзі. Асобныя кіраўнікі соцыялістычнай моладзі, якія ніяк не могуць пахваліцца сваёй рэволюцыйнасцю, крычаць, што КІМ, нібы «робіць паварот да рэфармізма».

Радам пераканаўчых довадаў тав. Чэмаданаў выкрывае ўсю нягрунтоўнасць гэтай дэмагогіі.

Комсамол з'яўляецца выхаваўчай юнацкай арганізацыяй, спачуваючай комуністычнай праграме. На якой аснове павінна будавацца выхаванне моладзі, як і ўся работа юнацкай арганізацыі ў капіталістычных краінах? Безумоўна, на класавай аснове, на аснове барацьбы супроць капіталізма. Аб гэтым ясна гаворыць рашэнні кангрэса. Але кангрэс разам з тым указаў, што дзверы юнацкіх арганізацый «павінны быць адчынены для ўсёй моладзі рабочага класа, а таксама для сялянскай, навучаючайся і іншай моладзі, якая шчыра і лаяльна жадае прымаць удзел у іх рабоце і развіцці». Ён указаў разам з тым, што **«арганізацыйныя формы саюзаў моладзі не могуць быць аднолькавымі для ўсіх краін, усіх абласцей і гарадоў, а павінны адпавядаць канкрэтным умовам і асаблівым задачам юнацкага руху».**

— Хто-ж заклікан выхоўваць моладзь у рэволюцыйным духу марксізма-ленінізма? — пытаецца тав. Чэмаданаў. — Відаць, тыя людзі, якія самі з'яўляюцца сапраўднымі паслядоўнікамі марксізма-ленінізма, — комуністы. Гэтага комуністы не ўтойвалі і не ўтойваюць. Якім-жа метадам яны будуць выхоўваць моладзь? Метадам пераканання і асабістага прыкладу.

Пачаўшы ажыццяўляць рашэнні VI кангрэса КІМ, некаторыя комсамолы «аджрылі», што моладзь цікавіцца не толькі палітыкай. «Аказалася», што моладзь цікавіцца спортам, спевамі, танцамі, авіяцыяй, турызмам. Аказалася, што моладзь любіць калектыўна праводзіць час і прагулкі ў лес, у горы, бліжэй да прыроды. І варта было толькі паклапаціцца аб задаваленні гэтых здаровых запросаў моладзі, як дзесяткі тысяч людзей сталі актыўна падтрымліваць комсамол.

Вядома, труднасцей яшчэ многа. Лінія VI кангрэса ўсвоена яшчэ не ўсімі комсамольскімі кіраўнікамі. Тав. Чэмаданаў прыводзіць прыклады няправільнага разумення гэтай лініі, вядучага да фактычнага яе зрыву.

— Аднак, — гаворыць ён, — усе гэтыя труднасці можна перамагчы. Было-б жаданне, упартасць і настойлівасць у дасягненні намечанай мэты і ў перамаганні перашкод, узнікаючых на шляху арганізацыі моладзі. А гэта ёсць у комуністычных саюзаў моладзі.

АДЗІНЫ ФРОНТ МОЛАДЗІ

Тав. Чэмаданаў падрабязна спыняецца на неаднаразовых спробах КІМ дабіцца ўстанаўлення адзінага фронта з Соцыялістычным Інтэрнацыяналам Моладзі. Усе гэтыя прапановы кіраўніцтва СІМ адхіліла.

— Факты і дакументы — упартая рэч, — гаворыць тав. Чэмаданаў. — Ясна, што калі-б не супраціўленне Выканкома СІМ, адзіны фронт рабочай моладзі быў-бы даўно створан у інтэрнацыянальным маштабе. Ясна, што кіраўніцтва СІМ знаходзіцца ў прамой залежнасці ад рэакцыйных правадыроў соцыял-дэмакратыі. У сілу гэтага кіраўніцтва СІМ апынулася ў хвасце руху адзінага фронта рабочай моладзі.

Выканком СІМ змог затармазіць устанаўленне адзінага фронта ў інтэрнацыянальным маштабе, але ён аказаўся бяссільным перад растучым рухам адзінага фронта ва многіх краінах. Паміма яго волі і жадання комуністычныя і соцыялістычныя саюзы **Францыі, Аўстрыі, Іспаніі, Латвіі, Швейцарыі, Аргентыны і Мексіці** і некаторых іншых краін устанавілі адзіны фронт.

У сумеснай барацьбе за інтарэсы моладзі, супроць фашызма і небяспекі імперыялістычнай вайны, моладзь пачынае ўсё больш усведамляць, што няма непераможных перашкод у аб'яднанні сіл. На VI кангрэсе КІМ была дэлегацыя іспанскай рэволюцыйнай комуністычнай і соцыялістычнай моладзі. Соцыялістычная дэлегацыя на кангрэсе заявіла, што яна падзяляе рашэнні кангрэса КІМ і бярэ на сябе абавязацельства быць ударнай брыгадай у барацьбе за адзінства рабочай моладзі. Бурнымі апладысментамі сустракае з'езд словы тав. Чэмаданава:

— Гэта заяўленне іспанская комуністычная і соцыялістычная моладзь з гонарам выканала. Комсамол і соцмол Іспаніі аб'ядналіся ў адной арганізацыі.

Блізка падыйшла да ажыццяўлення той-жа задачы рэволюцыйная моладзь Балгарыі, Францыі, Аўстрыі, Латвіі, Швейцарыі, Аргентыны і Мексікі. Комуністычныя саюзы моладзі гэтых краін і асабліва **Балгарыі і Францыі** на справе паказваюць прыклад барацьбы за аб'яднанне моладзі на аснове рашэнняў VI кангрэса КІМ.

— Комуністычны Інтэрнацыянал моладзі, — гаворыць тав. Чэмаданаў, — **гатоў пачаць перагаворы і супрацоўнічаць з усімі соцыялістычнымі юнацкімі арганізацыямі,** бо нішто не раздзяляе рабочую моладзь у барацьбе за яе правы.

Але гнёт і лішэнні ва ўмовах капіталістычнага ладу перажывае не толькі рабочая моладзь. Пераважная большасць маладога пакалення сялян, служачых, інтэлігенцыі, так званых сярэдніх слаёў насельніцтва таксама пакутуе ад беспрацоўя, ад немагчымасці атрымаць асвету, ад усіх пяжараў капіталізма. Гэта стварае спрыяючыя ўмовы для фармавання адзінага фронта ўсяго маладога пакалення працоўных.

У кожнай краіне масавы рух моладзі носіць свае нацыянальныя асаблівасці і формы. Ва Францыі развіваецца масавы рух «Фронта маладога пакалення». У ЗША — рух «Кангрэса моладзі». У Англіі — рух «Барацьбы за мір». У Іспаніі рух моладзі цесна звязан з рабоча-сялянскімі альянсамі, з народным фронтам, які паспяхова змагаецца супроць рэакцыі. У Кітаі — масавы, і перш за ўсё, студэнцкі рух барацьбы супроць японскага імперыялізма, за выратаванне радзімы.

Такое-ж згуртаванне нефашысцкай моладзі наглядаецца ў **Швейцарыі, Чэхаславакіі, Бельгіі, Грэцыі** і многіх іншых краінах.

— Што агульнага, інтэрнацыянальнага ў гэтых нацыянальных рухах моладзі? — гаворыць тав. Чэмаданаў. — Агульнае, таварышы, гэта барацьба супроць галечы, голаду, бяспраўнага становішча моладзі, барацьба за мір, супроць небяспекі фашызма і вайны.

Гэта інтэрнацыянальнае супрацоўніцтва мацнее. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца першы міжнародны юнацкі кангрэс барацьбы супроць фашызма і вайны, які адбыўся ў 1933 годзе ў Парыжы. Потым — міжнародная юнацкая канферэнцыя за мір, свабоду і прагрэс, якая адбылася ў 1936 годзе ў Бруселі, на якой былі прадстаўнікі 389 інтэрнацыянальных і нацыянальных юнацкіх арганізацый, яднаючых 12.000.000 членаў.

— Буржуазія прабуе ўсяляк сарваць гэты рух, — гаворыць тав. Чэмаданаў. — Моладзі ў капіталістычных краінах прыходзіцца перамагаць велізарныя труднасці ў сваёй барацьбе. Не так лёгка вызваліцца з палону буржуазнай ідэалогіі. Але, таварышы, аковы надломлены, і нішто не можа спыніць умацавання фронта маладога пакалення працоўных.

ГЕРОІ СУСВЕТНАГА КОМСАМОЛА

Барацьба за свабоду, за соцыялізм нараджае герояў. Найвялікшыя прыклады мужнасці і самаафяравання паказваюць рэволюцыйная моладзь капіталістычных краін. Тав. Чэмаданаў прыводзіць ряд прыкладаў гераічнай барацьбы замежных комсамольцаў, выклікаючых гарачыя прывітанні з'езда.

Ён гаворыць аб комсамоле Германіі, ва ўмовах фашысцкага падполля заваяваўшага званне гераічнага атрада КІМ, бязмежна адданага партыі Тэльмана. Аб таварышу Войкаве, сыне балгарскага народу, які з камеры смяротнікаў пісаў напярэдадні кары смерцю: «Мы — комсамольцы — пагарджаем усякую мальбу аб памілаванні. Мы — большэвікі, і ў нас толькі адзін шлях—шлях барацьбы». Аб апошнім пісьме гераічнага балгарскага таварыша Люцібродскага, напісаным перад карай смерцю:

«Вышэй галаву, бацька, мая дарагая жонка, мой малыш, мой сын, таварышы, наперад! Нават і з цяжкімі афярамі, але перамога будзе наша. Той, хто гатоў да афяры, даб'ецца перамогі! Фізічна мёртвыя, барацьбіты будуць прадаўжаць сваё існаванне ў памяці пераможнага пролетарыята. І дзеці пажнуць плады, за якія змагаліся іх бацькі».

Тав. Чэмаданаў заканчвае свой даклад.

— Тысячы прыкладаў гераізму, мужнасці і самаафярнасці, — гаворыць ён, — можна прывесці з барацьбы кітайскай, нямецкай, польскай і югаслаўскай рэволюцыйнай моладзі. У капіталістычным свеце ідзе жорсткая класавая вайна. Фашызм прабуе зверскі задушыць рэволюцыйны рух. Фашызм рыхтуецца абрушыцца контрэволюцыйным ударам на нашу соцыялістычную радзіму, якая з'яўляецца бацькаўшчынай працоўных і прыгнечаных усяго свету. Дык будзем-жа яшчэ больш упарта, яшчэ больш настойліва і яшчэ больш энергічна пад кіраўніцтвам правадыра народаў Сталіна і нашай слаўнай большэвіцкай партыі мацаваць вялікую дружбу і брацтва народаў! Дык будзем-жа з яшчэ большай энергіяй адстойваць вялікую справу міру!

Бурнымі апладысментамі сустракае з'езд словы дакладчыка:

— Няхай жыве непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна!

X З'ЕЗД ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА

НА ЗДЫМКУ — выступленне прэзідэнта Акадэміі навук СССР А. П. Карпінскага з прывітаннем з'езду.

Фото С. Ласкутова (Саюзфото).

Пленум Совета пры народным камісару шляхоў зносін

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВ. Л. М. КАГАНОВІЧА.

21 красавіка на ранішнім пасяджэнні пленума Совета пры наркоме шляхоў зносін па першаму пытанню — па дакладах начальнікаў дарог аб іх рабоце — выступіў народны камісар шляхоў зносін тав. **Л. М. Каганові́ч.**

Спатканы гарачымі доўгімі авацыямі ўсіх прысутных, тав. Каганові́ч у разгорнутай яркай прамове падрабязна прааналізаваў моцныя і слабыя бакі ў рабоце кожнай дарогі і намеціў канкрэтныя задачы дарог.

Тав. Каганові́ч указаў, што ў 1936 годзе нават параўнаўча адстаючыя, горш працуючыя дарогі усё-ж працуюць лепш, чым у 1934 і ў пачатку 1935 года працавалі перадавыя, лепшыя дарогі Саюза. Трапныя вобразныя характарыстыкі работы дарог і іх кіраўнікоў не раз перарываліся бурнымі апладысментамі. Выступленнем тав. Кагановіча закончыліся спрэчкі па першаму пытанню.

На вячэрнім пасяджэнні пленум Совета заслухаў даклады начальнікаў цэнтральных кіраўніцтваў НКШЗ аб палепшанні тэхналагічнага працэсу, тэхнічных нормах і нормах выпрацоўкі па адпаведных галінах чыгуначнай гаспадаркі.

X Усесаюзны з'езд ленінскага комсамола

Заключнае пасяджэнне 21 красавіка

НА ПАСЯДЖЭННІ ПРЫСУТНІЧАЛІ ТАВАРЫШЫ СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, АНДРЭЕЎ, ЧУБАР, ЖДАНАЎ, ХРУШЧОЎ

Да пачатку пасяджэння звонкія песні раздаюцца ў велізарнай зале Вялікага Крэмлёўскага палаца. На розных мовах жыццерадасная моладзь спявае аб адным — аб шчаслівым жыцці юнага пакалення сталінскай эпохі. 18 гадзін. За сталом прэзідыума з'яўляюцца таварышы **Сталін, Молатаў, Каганові́ч, Варашылаў, Андрэеў, Чубар, Жданаў, Хрушчоў, Косарэў.** З'езд сустракае тав. Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада магутным узрывам прывітанняў. Раздаюцца воклічы: Няхай жыве **Сталін!** Ура!, Таварышу **Сталіну**— комсамольскае прывітанне! **Сталіну** — палкае прывітанне! Ура!

Тав. Косарэў адкрывае пасяджэнне з'езда і дае слова для даклада мандатнай камісіі тав. **Карацяеву.** Лічбы і імёны, прыведзеныя ў дакладзе, гаворыць аб вялікай, гераічнай рабоце ВЛКСМ на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, аб выдатных людзях, выхаваных ленінскім комсамолам пад кіраўніцтвам партыі.

На з'ездзе прысутнічаюць 801 дэлегат з правам рашаючага голасу і 302 дэлегаты з правам дарадчага голасу. Яны прадстаўляюць велізарную армію перадавой моладзі Совецкага Саюза — 3.981.777 членаў ВЛКСМ.

Гэты з'езд — гаворыць дакладчык — з'яўляецца з'ездам перадавых, таленавітых прадстаўнікоў працоўнай моладзі.

— Першым дэлегатам, — заўляе пад бурныя авацыі тав. Карацяеў, — на ўсіх абласных, краявых канферэнцыях і рэспубліканскіх з'ездах комсамола выбран таварыш **Сталін.** Дазвольце мне перадаць мандат № 1 таварышу **Сталіну.**

Мандат, пад доўга не змаўкаючыя воклічы, уручаецца таварышу **Сталіну.**

Сярод дэлегатаў — 156 ордэнаносцаў. Стаханаўцы Краеўскі, Е. Вінаградава, Одзінцова, Канцэдалаў, Ліхарадаў, лепшыя маладыя чыгуначнікі Крыванос, Варанцоў, Багданаў, Огнёў, перадавыя людзі сацыялістычных палёў — Паша Ангеліна, Марыя Дземчэнка, Остраглядз, Гнапенка, Ламакіна і многія, многія іншыя — вось яны, дастойныя сыны і дочкі вялікай комуністычнай партыі.

У групе дэлегатаў, якія прадстаўляюць комсамол доблеснай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, знаходзяцца герой Совецкага Саюза Каманін, вядомы стратанаўт Пракоф'еў, парашутысты, чырвонафлотцы, пагранічнікі.

Апладысментамі сустракае з'езд паведамленне тав. Карацяева аб тым, што сярод дэлегатаў—прадстаўнікі 43 народнасцей, якія насяляюць Совецкі Саюз. 590 дэлегатаў упершыню прымаюць удзел на ўсесаюзным з'ездзе комсамола.

З'езд аднагалосна зацвярджае даклад мандатнай камісіі.

Пасля даклада мандатнай камісіі з паведамленнямі выступаюць ад камісіі па новай праграме ВЛКСМ тав. **Файнберг,** ад камісіі па новаму статуту ВЛКСМ — т. **Вершкоў** і ад камісіі па рэзалюцыі аб рабоце ў школе — тав. **Мускін.** Прыняўшы ўнесеныя папраўкі і змены, з'езд аднагалосна пад шумныя апладысменты зацвярджае праграму і статут ленінскага комсамола, а таксама рэзалюцыю па рабоце ў школе.

Затым з'езд прыступае да выбараў кіруючых органаў. У члены ЦК ВЛКСМ выбіраюцца 93 чалавекі, у кандыдаты — 35 чалавек, у члены Цэнтральнай рэвізійнай камісіі — 17 чалавек.

Парадак дня вычарпан. Старшынствуючы тав. **Косарэў** гаворыць першыя словы заключнай прамовы. Але вось з усіх бакоў велізарнай залы нечакана ўзнікае гул поўных захаплення авацый, грымяць воклічы «ўра», «Няхай жыве таварыш **Сталін**».

З'езд, які ўсё гэтыя дні з выключнай сілай дэманстраваў неразрыўную сувязь маладога пакалення будаўнікоў сацыялізма з роднай большэвіцкай партыяй, які дэманстраваў сваю бязмежную адданасць вялікаму правадыру народаў таварышу **Сталіну,** зноў зварачае да яго поўныя захаплення словы любві і прывету. Доўга пягнуцца авацыі. Яны зноў аднаўляюцца, калі тав. Косарэў гаворыць аб выніках X з'езда ВЛКСМ.

Прамова тав. А. В. КОСАРЭВА

НА ЗАКЛЮЧНЫМ ПАСЯДЖЭННІ X З'ЕЗДА ВЛКСМ 21 КРАСАВІКА

Таварышы! Мы заканчваем работу нашага з'езда.

З'езд ленінскага комсамола мае вельмі вялікае значэнне для ўсёй совецкай моладзі. Зусім зразумела, што яна з пільнай увагай каглядала за яго работай. Несумненна, што і ўсе працоўныя нашай краіны з гордасцю любаваліся лепшымі прадстаўнікамі маладога пакалення, якія сабраліся на свой з'езд, і сачылі за нашай работай.

Мне здаецца, што вынікі ўсёй работы з'езда можна бесспамылкова вызначыць, як поўную гатоўнасць совецкай моладзі, ленінскага комсамола ўсюды і ва ўсім ісці за нашай большэвіцкай партыяй... (апладысменты), як наспеўшую гатоўнасць моладзі з яшчэ большай настойлівасцю і пасляднасцю вучыцца ў партыі барацьбе за сацыялізм, вучыцца ў таварыша Сталіна (**бурныя апладысменты, усе ўстаюць, воклічы прывітання таварышу Сталіну**) таму, як жыць і выконваць вялікае вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна.

Наш з'езд прадэманстраваў найвялікшую гатоўнасць перадавой моладзі да яшчэ большага авладання навукай, культурай, тэхнікай.

У нас не толькі вялікае жаданне вучыцца, не толькі вялікая цяга да навукі, культуры, тэхнікі, але ў нас ёсць правільнае ўяўленне аб шляхах, якія забяспечваюць поспехі ў барацьбе за культуру, ёсць гераізм ў барацьбе за навуку і тэхніку.

Сваімі рашэннямі мы ўзялі на сябе абавязацельства перад усімі працоўнымі нашай краіны, перад Усесаюзнай комуністычнай партыяй (большэвікоў), перад Совецкім урадам, перад нашым другам, настаўнікам і правадыром таварышам Сталіным (**бурныя, доўгія апладысменты**), узялі на сябе абавязацельства працаваць яшчэ энергічней, працаваць яшчэ больш, вучыцца яшчэ лепш, і з уласцівым нам — маладому пакаленню большэвікоў — запалам мы гэтыя абавязацельствы выканаем. (**Бурныя апладысменты**).

Перадавая моладзь нашай краіны павінна працаваць узорна, умацоўваючы магутнасць і абароназдольнасць сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Наш з'езд прайшоў пад знакам разгорнутай самакрытыкі. Дазвольце, таварышы, спадзявацца, што гэта самакрытыка, непрымірымыя адносіны да сваіх уласных недахопаў будуць характарызаваць нас і ў далейшым.

Дазвольце, таварышы, спадзявацца, што рашэнні з'езда, накіраваныя на выхаванне вытрымана́й, культурнай, граматнай моладзі, накіраваныя на ідэйна-палітычны і культурны рост нашай моладзі, будуць безумоўна выкананы.

Дазвольце вам пажадаць добрага жыцця і яшчэ больш шчырай энергічнай работы. (**Апладысменты**).

Няхай жыве наша партыя, якая нас выхоўвае, абучае і рыхтуе з нас байцоў за справу комунізма! (**Апладысменты**).

Няхай жыве наш вялікі Сталін! (**доўгія апладысменты. Крыкі з месц: «Няхай жыве таварыш Сталін!»**), які выхоўвае бяссрашнае пакаленне маладых людзей сацыялістычнай дзяржавы.

Дзесяты з'езд абвяшчаецца закрытым.

(**Доўга не змаўкаючыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Уся зала стоячы пяе «Інтэрнацыянал»**).

Голас з месца: Няхай жыве вялікі Сталін. Ура! (**Крыкі «ўра», апладысменты**).

Сталін: Няхай жыве совецкая моладзь. Ура! (**Крыкі «ўра», доўгія апладысменты**).

Таварыш **Сталін,** кіраўнікі партыі і ўрада пёпла развітваюцца з дэлегатамі з'езда.

ЦК ВЛКСМ, выбраны X Усесаюзным з'ездам комсамола

ЧЛЕНЫ ЦК ВЛКСМ

1. Аўгустайціс А. В.; 2. Адміральская З. А.; 3. Андрэеў С. І.; 4. Артыкоў І.; 5. Белабародаў К. Г.; 6. Берэзін Н. А.; 7. Беспрозванных П. Я.; 8. Блюмкін Л. А.; 9. Богаутдынаў М. Г.; 10. Бальшакоў Г. М.; 11. Брандын А. Н.; 12. Бубекін В. М.; 13. Буланава К. Г.; 14. Васільева Т. Ф.; 15. Васільеў В. В.; 16. Вайшля І. С.; 17. Вершкоў П. А.; 18. Віктараў А. І.; 19. Волкаў М. Д.; 20. Волкава Е. П.; 21. Взробін А. І.; 22. Высоцкі А. А.; 23. Вышэмірская Р. І.; 24. Гаўрылаў В. К.; 25. Гадаеў І. Ф.; 26. Георгабіяні Г. І.; 27. Герцовіч Л. Б.; 28. Герасімаў В. Н.; 29. Герасімаў Н. Г.; 30. Гаршэнін П. С.; 31. Грубман М. Л.; 32. Давідовіч М. А.; 33. Далакішвілі Р. І.; 34. Дубінін Ф. І.; 35. Елагін М. Я. 36. Ерэнкоў М. Д.; 37. Ерастаў І. Л.; 38. Ерафіцкі К. М.; 39. Захараў В. В.; 40. Ільінскі С. Д.; 41. Казоўскі В. Н.; 42. Калашнікаў В. А.; 43. Клінкоў Н. В.; 44. Кавалёў К. І.; 45. Коган З. А.; 46. Казадзёраў Ф. П.; 47. Косарэў А. В.; 48. Краеўскі І. Э.; 49. Крыванос П. Ф.; 50. Кулаеў Абкаір; 51. Лешчынер Е. Д.; 52. Лістоўскі П. П.; 53. Лук'янаў Д. Д.; 54. Любін А. І.; 55. Март'янаў П. П.; 56. Мгеладзе А. І.; 57. Мехтыханаў Абдул Джамал Мехтыханавіч; 58. Мазалеўская Е. І.; 59. Мускін В. А.; 60. Назараў М. В.; 61. Паўлаў В. І.; 62. Панюхоў Н. Г.; 63. Пікіна В. Ф.; 64. Пракоф'еў Н. Ф.; 65. Раскін Б. М.; 66. Раждзественская В. К.; 67. Рудых Г. А.; 68. Савельеў А. П.; 69. Сідараў В. І.; 70. Смірнова А. В.; 71. Снеткоў Р. С.; 72. Сарокін В. П.; 73. Стукалаў Н. М.; 74. Татарнікаў А. С.; 75. Таштытаў Кайсар; 76. Тімірґаліна Ш. Т.; 77. Тумчэнак В. І.; 78. Тюрын М. В.; 79. Урын Г. Е.; 80. Усейнаў Сафар-Мамед Оглы; 81. Уткін С. А.; 82. Файнберг Е. Л.; 83. Харчэнка І. І.; 84. Чэмаданаў В. Т.; 85. Чарняўскі А. Ф.; 86. Чэрнілеўскі П. В.; 87. Чорны А. Д.; 88. Шахбазян А. Г.; 89. Шашырын А. М.; 90. Шоркін І. В.; 91. Шунько В. Н.; 92. Ярэмчук Г. Ф.; 93. Зіміна С. С.

КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ ЦК ВЛКСМ

1. Карацяеў В. С.; 2. Опендак Е. М.; 3. Шароеў С. А.; 4. Ражноў В. Т.; 5. Манаеў Г. Г.; 6. Валчок А. С.; 7. Мурашкін А. В.; 8. Якаўлева О. Н.; 9. Врублеўскі А. К.; 10. Медовы В. П.; 11. Безногіх С. І.; 12. Мінкін І. І.; 13. Пыхава В. Е.; 14. Камбараў Курман; 15. Курылёў А. К.; 16. Шмаёнак М. Б.; 17. Ловен Б. І.; 18. Сафонаў Б. Т.; 19. Жэлезны А. М.; 20. Строеў А. Я.; 21. Фрумкін А. Б.; 22. Красноў Э. В.; 23. Сідарава Л. А.; 24. Розін Д. Е.; 25. Перэльштэйн М. Л.; 26. Андрэеў С. А.; 27. Багдановіч В. В.; 28. Афрыкантаў В. І.; 29. Тарасаў Ф. П.; 30. Барзоў Л. Н.; 31. Нікалаева Т. Н.; 32. Аман Р. П.; 33. Архіпаў В. М.; 34. Парыжэр В. С.; 35. Швецоў В. І.

ЧЛЕНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ ВЛКСМ

1. Бляу Д. М.; 2. Вольберг Е. М.; 3. Гейро Э. Б.; 4. Гольдман Н. Л.; 5. Кузнецова В. Г.; 6. Егоранка О. К.; 7. Казлоў В. І.; 8. Лаўрыкаў Н. А.; 9. Мінаін М. Р.; 10. Макаранка Н. Д.; 11. Салыкаў Я. С.; 12. Сураўцоў Д. Н.; 13. Шаўчэнка А. Н.; 14. Кюбар П. Я.; 15. Крыўцоў А. А.; 16. Бас А. Г.; 17. Нікалаеў Б. І.

Першы пленум ЦК ВЛКСМ X склікання

21 красавіка адбыўся першы пленум ЦК ВЛКСМ X склікання.

Пленум выбраў сакратарыят, бюро ЦК ВЛКСМ і зацвердзіў загадчыкаў аддзеламі ЦК.

Генеральным сакратаром ЦК ВЛКСМ аднагалосна выбран А. В. **Косарэў.**

Сакратарамі ЦК ВЛКСМ выбраны:

Лук'янаў Д. Д., **Файнберг** Е. Л., **Вершкоў** П. А., **Гаршэнін** П. С., **Васільева** Т. Ф., **Пікіна** В. Ф.

Бюро ЦК ВЛКСМ выбрана ў наступным складзе:

Косарэў А. В., Лук'янаў Д. Д., Файнберг Е. Л., Вершкоў П. А., Гаршэнін П. С., Васільева Т. Ф., Пікіна В. Ф., Ільінскі С. Д., Андрэеў С. І., Вайшля І. С., Лешчынер Е. Д., Герцовіч Л. Б., Харчэнка І. І., Чэмаданаў В. Т., Бубекін В. М., Тімірґаліна Ш. Т., Мускін В. А., Снеткоў Р. С., Чорны А. Д.

Пленум зацвердзіў загадчыкаў аддзелаў ЦК ВЛКСМ.

Заг. аддзелам вучнёўскай моладзі — сакратар ЦК ВЛКСМ **Файнберг** Е. Л.

Заг. аддзелам рабочай моладзі— сакратар ЦК ВЛКСМ **Вершкоў** П. А.

Заг. аддзелам студэнцкай моладзі — **Лешчынер** Е. Д.

Заг. аддзелам па рабоце сярод моладзі дзяржустаноў і гандлёва-кааперацыйных арганізацый — **Герасімаў** Н. Г.

Заг. аддзелам кіруючых комсамольскіх органаў—**Герцовіч** Л. Б.

Заг. аддзелам піонераў — **Мускін** В. А.

Заг. аддзелам сялянскай моладзі — **Снеткоў** Р. С.

Намеснікам загадчыка аддзела вучнёўскай моладзі — **Тімірґаліна** Ш. Т.

Адказным рэдактарам «Комсомольской правды» зацверджан **Бубекін** В. М.

Старшынёй дэлегацыі ВЛКСМ у ВК КІМ зацверджан **Чэмаданаў** В. Т.

Пам. нач. палітупраўлення НК шляхоў зносін па комсамолу зацверджан **Чорны** А. Д.

СПАБОРНІЦТВА ДВУХ ЗАВОДАЎ

На галіннай канферэнцыі металапрамысловасці паміж дэлегатамі завода імя Варашылава і завода імя Кірава разгарэлася спрэчкі. Кіраўцы даказвалі, што дасягнутая імі выпрацоўка на стругальных варштатах з'яўляецца найвышэйшай, што больш павялічыць яе немагчыма. Варашылаўцы-ж, у прыватнасці стаханавец тав. **Харнас,** даказвалі, пацвярджаючы ўласнай практыкай, што высунутыя кіраўцамі нормы заніжаны. Галінная канферэнцыя, прымаючы новыя нормы, якія будуць уведзены з 1 мая, улічыла ўказанні варашылаўцаў, угрунтаваныя на дакладных тэхнічных разліках.

Там-жа на канферэнцыі механічны цэх завода імя Варашылава выклікаў на соцспаборніцтва па асваенню новых норм механічны цэх завода імя Кірава.

21 красавіка стругальшчык-стаханавец завода імя Варашылава тав. **Ґаляшэвіч** (былы вучань Харнаса) і начальнік механічнага цэха гэтага завода тав. **Міньковіч** прышлі на завод імя Кірава, каб падзяліцца вопытам стаханаўскай работы.

Тав. Галяшэвічу далі складаны прадольна-стругальны варштат 3-ПС ленінградскага завода імя Свердлова. Не гледзячы на тое, што на сваім заводзе ён працуе на варштаце зусім іншай сістэмы (нямецкі варштат «Велетэр»), ён усё-ж і на новым варштаце перакрыў увядзімыя з 1 мая новыя нормы выпрацоўкі.

Для стругання цэнтравальнай станіны дана 8 гадзін 40 мін., а тав. Галяшэвіч, прымяніўшы стаханаўскія метады работы, зрабіў гэта за 7 гадзін.

— Калі-б на варштаце 3-ПС я папрацаваў некалькі дзён, — заявіў тав. Галяшэвіч, — то я-б павялічыў прадукцыйнасць у два разы.

Пасля работы ў механічным цэху завода імя Кірава адбылася вытворчая нарада па вывучэнню метадаў работы тав. Галяшэвіча. Нарада прайшла з вялікім уздымам. Кіраўцы пераканаліся, што прымяненне шырокіх разцоў, якія прынёс з сабою тав. Галяшэвіч, павышае прадукцыйнасць у 2—3 разы, што шматлікія, на першы погляд дробныя прыстасаванні, якія ён ужыў, таксама спрыяюць паскарэнню і аблягчэнню работы. Стаханаўцы завода імя Кірава (тав. **Машанскі** і іншыя) абавязаліся пераняць метады тав. Галяшэвіча, і асвоіўшы іх, праводзіць струганне цэнтравальнай станіны за чатыры гадзіны.

Выступіўшы тав. **Галяшэвіч** рэзка крытыкаваў недахопы ў рабоце цэха і адзначыў асабліва дрэннае забеспячэнне інструментамі з боку інструментальнага цэха. Ён выказаў надзею, што сяброўская сувязь паміж рабочымі завода будзе ўмацоўвацца, што ўзаемная сацыялістычная дапамога паслужыць агульным інтарэсам уздыму прадукцыйнасці працы.

Гэтымі днямі лепшы стаханавец фармоўшчык завода імя Кірава тав. **Васілеўскі** будзе працаваць на заводзе імя Варашылава для перадачы свайго вопыту варашылаўцам.

Так наладжваецца ўзаемны абмен лепшымі метадамі стаханаўскай работы паміж двума буйнейшымі заводамі сталіцы БССР.

Р. Д.

ЦЭХ ПА АЭРОБНАЙ МОЧЦЫ ІЛЬНУ

Галоўнае кіраўніцтва ільняной прамысловасці Наркамлегпрома СССР зацвердзіла праект будаўніцтва цэха па аэробнай мочцы ільну са штучнай сушылкай пры шклоўскім ільнозаводзе. Праект распрацаван Навукова-даследчым інстытутам прамысловасці БССР пад кіраўніцтвам старшага навуковага работніка тав. **А. Л. Пескіна.** Аэробная мочка ільну (штучнае дажджаванне) дае магчымасць вызваліцца ад саматужных метадаў мочкі трасты і ліквідаваць сезоннасць апрацоўкі ільну. Магутнасць цэха аэробнай мочкі пры шклоўскім заводзе разлічана на апрацоўку 3.030 тон ільносаломы за год. На будаўніцтва цэха, які павінен уступіць у эксплаатацыю восенню гэтага года, адпушчана 200 тыс. руб.

Вышэй тэмпы і якасць веснавой сяўбы!

ХОД СЯЎБЫ ЯРАВЫХ І ВОРЫВА ПА БССР НА 20 КРАСАВІКА

РАЁНЫ	Засеяна яравых: У гектарах	Проц. выканання	У тым ліку засеяна азімых у проц.	Узарана ў гектарах
1. Бабруйскі	14857	45,9	78,8	8312
2. Капаткевіцкі	5930	39,8	54,6	5060
3. Старобінскі	7840	38,1	70,6	3714
4. Тураўскі	2842	38,1	62,4	130
5. Ельскі	5992	37,1	47,4	5913
6. Петрыкоўскі	5460	36,7	49,8	2700
7. Нараўлянскі	6636	36,1	50,1	6018
8. Жыткавіцкі	3566	34,9	51,2	3146
9. Мазырскі	8678	33,7	53,0	8763
10. Даманавіцкі	9191	33,5	55,4	6112
11. Граскі	5810	29,1	59,4	1824
12. Брагінскі	4990	26,2	54,9	5182
13. Камарынскі	3027	26,1	45,7	3496
14. Лельчыцкі	3761	24,6	30,1	4324
15. Чырвонаслабодскі	3774	20,3	43,2	2112
16. Лоеўскі	4345	19,3	33,8	5219
17. Хойніцкі	4507	19,1	38,7	6455
18. Рэчыцкі	6356	17,4	33,9	4900
19. Ушацкі	5317	16,2	24,3	727
20. Парыцкі	4492	16,0	28,5	5578
21. Глускі	4608	14,6	22,2	3548
22. Капыльскі	4749	12,5	31,5	2853
23. Уздзенскі	2759	13,3	19,7	6709
24. Лепельскі	4157	13,2	14,0	7457
25. Кіраўскі	4118	12,6	24,7	7548
26. Свяцілавіцкі	2210	11,1	21,5	2678
27. Веткаўскі	1856	9,6	19,6	2375
28. Старадарожскі	1884	9,4	16,3	3806
29. Чашніцкі	2681	9,3	6,8	6027
30. Слупкі	2843	8,8	16,4	3101
31. Жураўлікі	1740	8,2	12,7	2400
32. Прапойскі	2076	8,0	14,4	4097
33. Бярэзінскі	2677	7,6	13,7	9816
34. Жлобінскі	3067	7,5	13,7	4001
35. Бягомльскі	1345	7,1	12,3	3982
36. Любаньскі	1414	6,6	14,0	3118
37. Смілавіцкі	1782	6,6	10,7	3405
38. Чэрвеньскі	1960	6,6	8,0	2954
39. Пухавіцкі	1349	6,5	13,3	4246
40. Уваравіцкі	1671	6,3	13,7	2927
41. Чачэрскі	1210	6,2	12,4	1805
42. Заслаўскі	1165	5,2	9,5	2580
43. Асіпавіцкі	1001	5,0	10,1	2343
44. Кармянскі	1486	5,0	9,3	4886
45. Дзяржынскі	1578	4,7	7,0	7086
46. Смалявіцкі	1624	4,6	7,7	5027
47. Рагачоўскі	1720	4,3	8,1	4054
48. Добрушскі	593	4,1	7,5	2212
49. Церахаўскі	1177	4,0	7,2	3504
50. Бялыніцкі	1264	3,9	6,3	7833
51. Крупскі	842	3,8	7,3	4703
52. Менскі	1618	3,8	6,6	1875
53. Выхаўскі	1527	3,7	7,2	8997
54. Лагойскі	909	3,5	5,8	3631
55. Барысаўскі	1082	3,3	6,2	4580
56. Сенненскі	1126	3,3	3,2	6617
57. Гомельскі	671	3,2	5,8	2670
58. Чэрыкаўскі	864	3,1	5,2	3548
59. Буда-Кашалёўскі	588	2,7	5,3	2695
60. Талачынскі	995	2,5	1,1	3007
61. Ветрынскі	521	2,3	4,4	4541
62. Віцебскі	646	2,1	4,8	4009
63. Крычаўскі	382	1,9	4,2	2826
64. Хоцімскі	436	1,9	3,8	1791
65. Асвейскі	280	1,8	3,9	2503
66. Халопеніцкі	469	1,8	3,1	5158
67. Магілеўскі	975	1,7	3,3	9581
68. Сіроцінскі	533	1,6	3,4	3561
69. Чырвонапольскі	441	1,5	2,8	3713
70. Лёзнянскі	646	1,5	1,4	4724
71. Дрыбінскі	513	1,4	2,8	6093
72. Дубровенскі	516	1,4	1,0	3917
73. Дрысенскі	455	1,3	2,9	5454
74. Каснюковіцкі	473	1,2	2,5	2600
75. Аршанскі	627	1,1	1,5	5206
76. Суражскі	246	0,8	1,2	1725
77. Горацкі	271	0,7	1,1	6314
78. Гарадоцкі	178	0,6	1,2	2161
79. Шклоўскі	312	0,6	0,4	8393
80. Клічаўскі	114	0,5	1,1	2481
81. Багушэўскі	135	0,5	1,1	599
82. Клімавіцкі	192	0,5	0,9	2567
83. Мехаўскі	139	0,4	0,9	2442
84. Расонскі	100	0,4	0,8	3163
85. Мсціслаўскі	158	0,3	0,7	5307
86. Плешчаніцкі	79	0,3	0,7	4457
87. Чаўскі	115	0,3	0,5	3283
88. Круглянскі	84	0,3	0,5	5014
89. Полацкі	—	—	—	475
90. Бешанковіцкі	—	—	—	—
Па БССР:	**201396**	**7,8**	**13,5**	**380489**
Было на 15 красавіка 1936 г.:	60036	2,3	4,4	160566
Было на 20 красавіка 1935 г.:	358534	13,9	19,7	381910

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ НКЗ БССР.

Ліквідаваць адставанне паўднёвых раёнаў

Па БССР на 20 красавіка план сяўбы яравых выкананы на 7,8 проц. Засеяна 201 тысяча 396 гектараў яравых.

Ход сяўбы ў гэтым годзе адрозніваецца ад мінулых гадоў перш за ўсё арганізаванасцю. Рад адставаўшых у мінулым годзе па сяўбе раёнаў выходзяць на ўзроўні перадавых. **Бабруйскі** раён, напрыклад, які ў мінулым годзе да 20 красавіка засеяў каля 5.000 гектараў, у бягучым годзе на гэтае-ж чысло засеяў 14.857 гектараў. Тое-ж самае можна сказаць і аб **Рэчыцкім, Капыльскім, Уздзенскім** і радзе іншых раёнаў.

Паўднёвыя раёны прыступілі да масавай сяўбы на 7—8 дзён раней астатніх раёнаў БССР. Між тым некаторыя раёны Мазырскай акругі яўна адстаюць. Лоеўскі раён, напрыклад, засеяў усяго толькі 19,3 проц., **Камарынскі** — 26,1, **Лельчыцкі** — 24,1. Недапушчальна адстае **Слуцкі** раён, які засеяў усяго толькі 8,8 проц. плана.

У Лоеўскім раёне ў пагоні за тэмпамі многія калгасы сталі на шлях яўнага ігнаравання агратэхнікі. У калгасе «Вялікая ніва» у прысутнасці агранома **Мельнікавай,** брыгадзіры **Каржанаў, Кашчэнка і Нечай** правялі пасеў аўса непратручаным насеннем. Калгасы «Чырвоная ніва» і імя Соўнаркома ні аднаго гектара не пасеялі радковай сеялкай. Сяўба праводзіцца выключна ўручную.

Многія забываюць аб тым, што работа кожнага калгаса будзе ацэньвацца перш за ўсё па ўраджайнасці.

Для гэтага патрабуецца толькі адно: **спалучаць тэмпы сяўбы з высокай якасцю.** Іменна ў гэтым сутнасць барацьбы за высокі ўраджай.

Стаханаўскія папраўкі ў рабоце трактараў

Рабочай хуткасцю ў трактары «ХТЗ» лічыцца 2-я хуткасць, якая дае 4,5 кіламетра ў гадзіну. На 3-й хуткасці, якая дае ў гадзіну 7,4 кіламетра, дазвалялася працаваць толькі на халастых пераездах.

Але яшчэ ў мінулым годзе многія трактарысты МТС «нелегальна» прымянялі 3-ю хуткасць на некаторых работах, асабліва на радковай сяўбе, дзе ў большасці трактар «ХТЗ» з адной радковай сеялкай працаваў з недагрузкай. Пры гэтым норма выпрацоўкі замест 10,5 гектара ў змену даходзіла да 22—26 гектараў, нікольні не зніжаючы якасці сяўбы.

Я лічу, што 3-й хуткасці пры радковай сяўбе трэба даць законнае права. Гэта мае вялікае значэнне ў справе павышэння плошчы радковай сяўбы, улічваючы недахват па МТС сеялак, а таксама значна можа скараціць тэрміны сяўбы.

Безумоўна, пры гэтым трэба ўлічыць, што ўстанаўляць сеялку на высеў трэба з разліку абаротаў кола не на 2-й хуткасці, а на 3-й: агрэгат павінен быць абсталяван маркерам, неабходзен уважлівы догляд агрэгата трактарыстамі, а таксама дапускаць сяўбу на больш роўных, добра апрацаваных і не камяністых глебах. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на задзелку насення.

На 3-й хуткасці магчыма працаваць і на іншых відах работ, асабліва тады, калі ў МТС не хапае прычэпнага інвентару і машын, адпавядаючых магутнасці данага трактара, і прыходзіцца пускаць трактар з другім інвентаром, якім поўнасцю нельга нагрузіць трактар (як, напрыклад: дыскаванне, культывацыя, ворыва на трактары «ХТЗ» з трохкорпусным плугам і інш.).

Я прыхожу да вываду, што працаваць на 3-й хуткасці з адной радковай сеялкай безумоўна магчыма і неабходна.

Тэхінспектар гародне-бульбянога кіраўніцтва НКЗБ, механік

А. СЯРМЯЖКА.

СЕЯЛКІ ПОУНАСЦЮ НЕ СКАРЫСТОУВАЮЦЦА

ЦЕРАХАЎКА. Старшыня калгаса «Воля», Пракопаўскага сельсовета, тав. **Мацюшоў** увесь час заяўляў, што сеялкі адраманцтаваны. А як прыступілі да сяўбы, выявілася зусім адваротнае. Абедзве сеялкі няспраўныя. Калгас пачаў сеяць усе збожжавыя культуры рукамі. Ужо засеяна рукамі больш 17 гектараў аўса. Тав. Мацюшоў і зараз не прыняў ніякіх мер, каб пусціць сеялкі ў ход.

Першыя гектары яравых засеяны рукамі ў калгасе «Соцыялізм», Церухскага сельсовета. З пачатку сяўбы радковая сеялка стаяла без работы. Засеяна ўсіх зернавых 55 гектараў, а сеялкай толькі 8.

Калгас «Пяскі», Глыбоцкага сельсовета, павінен засеяць радковай сеялкай 250 гектараў. Дагэтуль засеяна толькі 10 гектараў сеялкай, а рукамі — 85 гектараў. Тут ёсць дзве сеялкі — трактарная і конная. Працуе толькі конная. Замест нормы ў 4 гектары яна засявае ўсяго 2—2,5 гектара. Трактарная сеялка прыбыла ў калгас больш трох дзён. Першы дзень яна стаяла нявыкарыстанай, у другі ўстанаўлялі і толькі на трэці выйшла ў поле. Але працуе сеялка з вялікімі перабоямі. Больш паловы часу яна стаіць без работы.

Ёсць спробы сеяць непратручаным насеннем. У калгасе «Соцыялізм» і «Воля» засеяна непратручаным насеннем больш 10 гектараў. Як правіла, у калгасах не складаюцца акты аб пратручванні насення з удзелам агранома.

Якасць сяўбы ў асобных калгасах раёна недапушчальна дрэнная. У калгасе «Чырвоны рассвет» авёс засеян у аднавор. Поле не прабаранавана, многа агрэхаў. У другой брыгадзе калгаса «Пяскі» сяўбу ільну праводзяць на дрэнных папяродніках. Ворыва ў калгасе мелкае. Якасць сяўбы выключна нізкая.

У раёне яшчэ не ўлічылі ўрокаў першых дзён сяўбы.

ЛОСЬ.

НА ПАДНОЖНЫ КОРМ



Каровы калгаснікаў калгаса «Пяцігодка», Менскага раёна, выйшлі ў поле.

Фото Я. Салавейчыка.

ЧАТЫРЫ МЕСЯЦЫ Ў АБІСІНІІ



Кіноаператары Саюзкінохронікі тт. Б. Б. Цэйтлін і В. С. Ешурын, якія прабылі ў Абісініі чатыры месяцы і 21 красавіка вярнуліся ў СССР (гп. «Звязду» ад 22 красавіка), зазнялі каля 15 тысяч метраў кіноплёнкі. Совецкія кіноаператары наведалі самыя аддаленыя мясцовасці Абісініі і зрабілі шмат здымкаў на фронтах італа-абісінскай вайны. НА ЗДЫМКУ, злева, кіноаператары (злева направа) Цэйтлін і Ешурын перад сваёй палаткай у Дэсіе; справа — абучэнне абісінскіх салдат у Адыс-Алеме. Здымкі прыезда прадстаўлены «Звяздзе» тт. Цэйтліным і Ешурыным.

ПРАБЫВАННЕ НАРВЕЖСКАГА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ У МАСКВЕ

Раніцай 21 красавіка міністр замежных спраў Нарвегіі п. Кот аглядаў Крэмль. У адну гадзіну дня. п. Кот быў прыняты старшынёй ЦВК СССР М. І. Калініным. У 1 гадзіну 30 мінут п. Кот быў прыняты старшынёй Совета Народных Камісараў СССР В. М. Молатавым.

У 2 гадзіны дня старшыня Совета Народных Камісараў СССР В. М. Молатаў даў у гонар міністра замежных спраў Нарвегіі п. Кот снеданне. На снеданні прысутнічалі таварышы К. Е. Варашылаў, А. І. Мікаян, Я. Э. Рудзутак, Н. К. Анціпаў, М. М. Літвінаў, А. П. Розенгольц, Г. Ф. Грынько, І. С. Уншліхт, Н. Н. Крэсцінскі, Б. С. Стаманякоў, Г. Л. Пятакоў, Н. А. Булганін, А. М. Магільны, нарвежскі паверанны ў справах п. Болстад і адказны супрацоўнік Наркамата замежных спраў.

У часе снедання В. М. Молатаў і п. Кот абмяняліся прамовамі.

Увечары міністр замежных спраў Нарвегіі п. Кот прысутнічаў у Вялікім тэатры на балеце «Раймонда».

РЭЙНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ — УМАЦАВАНАЯ ЗОНА

ПАРЫЖ, 21 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе газета «Экспэльсіор», рэйнская цяжкая прамысловасць атрымала буйныя заказы на пабудову ўмацаванняў у Рэйнскай зоне.

— Урад Гітлера — піша газета — прыступіў «да пабудовы грознага пояса крэпасцей». Гэта ўмацаваная лінія пачынаецца каля германа-галандскай граніцы і заканчваецца каля швейцарскай граніцы. Работы пачаліся ўжо, і пры тым такімі ўзмоцненымі тэмпамі, што каля Аахена рабочыя баставалі некалькі гадзін, пратэстуючы супроць вельмі знесіляючага характару работ.

ВАЙНА У АБІСІНІІ

НАСТУПЛЕННЕ ІТАЛЬЯНЦАЎ НА АДЫС-АБЕБУ

ЛОНДАН, 20 красавіка. Паводле паведамленняў з Адыс-Абебы, італьянцы занялі Джыджыгу, а таксама (па непацверджаных даных) Харар. З Дэсіе італьянцы наступаюць двума калонамі: адна накіроўваецца на Аваш (на чыгунцы Адыс-Абеба — Джыбуці) і другая да гор паўночнай часткі княжства Шоа. Першая калона дасягнула Анкабера. Карэспандэнт «Таймс» лічыць, што Адыс-Абеба будзе занята італьянцамі праз некалькі дзён.

Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, усю ноч на 20 красавіка грузавікі з людзьмі і маемасцю пакідалі сталіцу. Горад амаль апустэў. Губернатар Адыс-Абебы выдаў загал, які забараняе адступаючым войскам уваходзіць у горад.

У Адыс-Абебе агалошана адозва негуса, якая заклікае ўсё мужчынскае насельніцтва ісці на фронт.

АДОЗВА АБІСІНСКАЙ ІМПЕРАТРЫЦЫ

АДЫС-АБЕБА, 21 красавіка. (БЕЛТА). Абісінская імператрыца Манон звярнулася з заклікам да народаў свету:

«З прычыны незлічоных лютасцей, правадзімых над народам маёй краіны агрэсарам, — гаворыцца ў закліку, — я зварачаюся да свету, як імператрыца, жонка і маці. Народы іншых краін, якія не перажылі жахаў сучаснай вайны, не могуць сабе ўявіць пакут, перажываемых маім народам. Мы біліся і будзем біцца да канца, але мы маем патрэбу ў большай дапамозе для таго, каб супраціўляцца лютаму знішчэнню нашага народу.

Мы дзякуем тым, хто стаяў за нашу справу, і чакаем, што яны будуць прадаўжаць намаганні для дасягнення міру і справядлівасці».

ПАСЛЯ КРЫВАВЫХ ПАДЗЕЙ У ЛЬВОВЕ

Буйная дэманстрацыя беспрацоўных у Пазнані

ВАРШАВА, 21 красавіка. (БЕЛТА). Газеты паведамляюць з Пазнані, што там учора адбылася буйная дэманстрацыя беспрацоўных. Дэманстранты сабраліся ля будынка ваяводскага ўпраўлення, патрабуючы работы. Делегацыю беспрацоўных прыняў ваявода Марушэўскі. Ён абяцаў дэлегацыі, што будуць арганізаваны грамадскія работы. Затым дэманстранты рушылі да ратушы, дзе паслалі делегацыю да прэзідэнта горада. На плошчы свабоды дэманстрацыя была рассеяна паліцыяй.

Усеагульная забастоўка у Львове

ВАРШАВА, 21 красавіка. (БЕЛТА). Львоўскі карэспандэнт газеты «Роботнік» (орган ППС), апісваючы ўчарашнюю 24-гадзінную ўсеагульную забастоўку пратэсту супроць дзеянняў паліцыі, падкрэслівае, што ўвесь горад знаходзіўся пад уражаннем гэтага «імпануючага і сур'ёзнага выступлення».

Забастоўка ахапіла ўсе комунальныя прадпрыемствы, трамваі і прыватныя прадпрыемствы. Большасць магазінаў была закрыта. Вячэрнія газеты ва Львове не выйшлі. Тэатры і кіно былі закрыты.

Львоўская паліцыя зрабіла ўчора новыя масавыя арышты. Усеагульную забастоўку львоўскіх рабочых падтрымалі рабочыя горада Пшэмышля (Львоўскае ваяводства).

Змова „палкоўніцкай групы"

ВЕНА, 21 красавіка. (БЕЛТА). Рад газет тлумачыць адтэрмінаванне паездкі польскага прэм'ера Касцялкоўскага ў Будапешт выступленнем так званай «палкоўніцкай групы» ўрадавага лагера супроць урада. Газета «Вінер таг» у паведамленні з Варшавы піша:

«Палкоўніцкая група, кіруемая галоўным рэдактарам афіцыёзнай «Газета польска» палкоўнікам Медзінскім, распрацавала свой план дзеянняў на час адсутнасці прэм'ера Згодна гэтага плана меркавалася прапанаваць прэзідэнту перадаць уладу ў рукі палкоўніцкай групы, каб увесці суровы рэжым у краіне. Пачаткам ажыццяўлення гэтага плана з'явіўся артыкул палкоўніка Медзінскага ў «Газета польска», паслужыўшы прычынай канфіскацыі нумара газеты. У сувязі з гэтым прэм'ер Касцялкоўскі адклаў сваю паездку ў Венгрыю.

Падобнае-ж паведамленне перадае і варшаўскі карэспандэнт газеты «Тэлеграф».

НАПЯРЭДАДНІ 1 МАЯ

* Ва ўсіх свінагадоўчых соўгасах рэспублікі праходзіць узмоцненая падрыхтоўка да першамайскага свята. У соўгасах імя Свердлова, Дзяржынскага раёна, «Замошша», Плешчаніцкага раёна, «Нача-Шпакоўшчына», Ветрынскага раёна, «Чырвоны маяк», Журавіцкага раёна, і ў соўгасе «Усце», Аршанскага раёна, у дні першамайскіх свят адбудуцца таварыскія сустрэчы знатных людзей соўгасаў—ордэнаносцаў са стахановцамі соўгасаў. Маёўкі з масавымі гульнямі і танцамі арганізуюцца ў соўгасах імя Дзяржынскага, Капыльскага раёна, імя Гікало, Ветрынскага раёна, імя Кірава, Чырвонаслабодскага раёна, і т. д. Конна-спартыўныя спаборніцтвы, скачкі і бегі будуць праведзены ў соўгасах «Ялава», Чавускага раёна, імя Свердлова, Дзяржынскага раёна.

* Мопраўская арганізацыя Барысава рыхтуе вагон падарункаў 2-му інтэрнацыянальнаму дзіцячаму дому. Мопраўцы фабрыкі імя Кірава закупілі піяніна ў падарунак гэтаму дому; мопраўцы камбіната імя Комінтэрна пасылаюць шахматы, шашкі, більярд і кракет, шклозавода — розныя шкляныя вырабы і т. д.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР

У першамайскія дні ў Менску адкрыецца пасля пераабсталявання дзіцячы гукавы кінотэатр. У зале для глядачоў да 400 месц. Добра абсталёўваецца фойе. Адводзіцца некалькі пакояў для масавых гульняў. Кіно будзе мець чытальню і буфет. У ніжняй частцы фойе — фантан. Пры тэатры будуць працаваць педагог і два масавікі.

ВЫДАННЕ МАТЭРЫЯЛАЎ X З'ЕЗДА ВЛКСМ

Партвыдавецтва ЦК КП(б)Б выдае на беларускай мове матэрыялы X з'езда ВЛКСМ. Справаздачны даклад тав. Косарэва здадзен у друк. Брашура выйдзе 20-тысячным тыражом к 1 мая. (БЕЛТА).

КАЛГАСНАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ ПА РАДЫЁ

МАЗЫР, 22 красавіка. (Кар. «Звязды»). Мазырскі раённы аддзел радыёвяшчання арганізуе выступленне каля мікрафона раду калгасных харавых і музычных гурткоў.

Першае выступленне адбылося гэтымі днямі. Выступаў зводны калгасны хор сельгасарцелей «Ударнік» і «Чырвоны сцяг», Юравіцкага сельсавета, пад кіраўніцтвам настаўніка няпоўнай сярэдняй школы тав. Катцана. Хор выканаў рад рэвалюцыйных і народных песень. Калгасніца Маруся Грачэнка выканала пад гармоніку пасеўныя частушкі.

23 красавіка адбудзецца выступленне струннага аркестра і хора нацыянальнага польскага калгаса імя Дзержынскага. 2 мая выступленне лепшых калгасных спевакоў і музыкаў Мазыршчыны будзе трансляваца праз менскую радыёстанцыю.

УСЕСАЮЗНЫЯ ЦЯЖКААТЛЕТЫЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ БУДАЎНІКОЎ

Учора ў клубе металістаў у Менску пачаліся другія ўсесаюзныя спаборніцтвы саюза комунальна-жыллёвага будаўніцтва па барацьбе, штанзе і боксу. На спаборніцтвы прыбылі каманды цяжкаатлетаў Ленінграда, Кіева, Баку, Крыма і Растова на Доне. Сярод удзельнікаў рэкардсмен СССР па штанзе Шульц (Баку), вядомы бакінскі барэц Назар'ян, ленінградскі гіравік Кантаровіч, менскія барцы браты Іоселевічы, Майзельс і Міркі. Штангісты ўчора выступалі з двума рухамі — жым і рывок левой рукой Адбыліся першыя схваткі на каўры і першыя баі на рынгу. Спаборніцтвы працягнуцца тры дні.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Згодна пастановы сакратарыята Менгаркома КП(б)Б ад 4 красавіка 1936 г., арганізуецца семінар для прапагандыстаў у пачатковых і сярэдніх школах па вывучэнню гісторыі партыі. Першыя заняткі семінара адбудуцца 25 красавіка, у 8 г. вечара, у клубе работнікаў асветы — Комуністычная, 19.

Кіраўнік семінара — тав. Гершон.

На семінар павінны з'явіцца наступныя таварышы: Сінчыліна, Златкіна, Шабекін (Леннартгарадок), Радзюк, Давідовіч, Хейфец, Янсон (НКАсветы), Баброніцкі, Станкевіч, Вайншток, Крываносаў, Казлоў, Дземін (БелАН), Машукова, Левін (Гістпарт), Ашаровіч, Кругляк (газ. «Окцябр»), Даўгаполаў (польпедтэхнікум), Новадворац (Інстытут нац. менш.), Астроўскі (гарана), Путнынь (школа № 9), Буклей (школа № 42), Касараўскі (школа № 37), Бунін (завод імя Молатава).

Заг. аддзелам культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома ЧЫЖОВА.

23 красавіка, у 17 гадзін, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) склікаецца нарада сакратароў парткомаў і партгрупаў Кагановіцкага горраёна.

Явка абавязкова.

Кагановіцкі РК КП(б)Б.

СПІС ТАВАРЫШОЎ, ВЫЛУЧАНЫХ МЕНГАРКОМАМ І ГОРРАЙКОМАМІ КП(Б)Б ДА КЛАДЧЫКАМІ АБ І МАЯ

СТАЛІНСКІ РАЁН

Готфрыд (ЦК КП(б)Б) — завод імя Кірава, **Сурта** (БелАН) — завод імя Варашылава, **Конік** (ЦК КП(б)Б) — завод «Большэвік», **Ткачэвіч** (ЦК КП(б)Б) — завод «Чырвоная зара», **Тавакальян** (ЦК КП(б)Б) — фабрыка імя Крупскай, **Сідэрэнка** — млын імя Дзержынскага, **Мілонаў** (ЦС АСО)—Будвучастак 91, **Сераброўскі** (ЦС АСО) —Учдор 711, **Гераўкер** (ЦК)—МТМ, **Ведзякін** (рэдакцыя газ. «Рабочий») — Менхарчгандаль, **Фішбейн** (рэд. газ. «Рабочий») — кантора Белкомунбуда, **Жуковіч** (горсовет) — аўтарамонтная станцыя, **Выдра** (ВКСГШБ) — архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, **Лур'е** (ВКСГШБ)—музтэхнікум, **Лазоўскі** (ВКСГШБ) — арцель «Другая пяцігодка», **Радзецкі** (ВКСГШБ)—чыгуначная цэнтральная кантора, **Фрэйзін** (ВКСГШБ) — аўташкола, **Карабан** (Дзяржбібліятэка)—ГУМ, **Шпітальнік** (КІЖ) — паштовая кантора. **Клімаў** (КІЖ)—тэлеграф, Немец (КІЖ) — «ВЭА», **Драгілеў** (КІЖ) — 1 совецкая больніца, **Розіна** (Гістпарт) — арцель «Чырвоны Кастрычнік», **Забела** (ЦК) — АТС, **Яцкевіч** (Гістпарт) — аддзел ачысткі, **Шчарбакоў** (БелАН) — тэатр оперы і балета, **Екельчык** (ЦК) — дзіцячая клініка, **Кузняцоў** (ЦК) — паліклініка, **Шнейдэр** (БелАН) — Гастраном № 1, **Рэкаў** (БелАН) — ясельныя работнікі, **Андрыеўскі** (НК замежных спраў) — будаўніцтва Дома Чырвонай арміі, **Клейнберг**—ТЭЦ, **Зюськоў** (Гістпарт) — мясакамбінат, **Чычкоўскі** — тэхнік. хлебапячэння, **Жырыкоў** — арцель «Чырвоны інвалід», **Хаін-Юмскі** (рэдакцыя «Рабочий») — фабрыка «Комунарка», **Сігналаў** (ЦК КП(б)Б)—спіртзавод.

РЭЗЕРВ

Кірушын (БелАН), **Проценка** (ГК КП(б)Б), **Дашуневіч** (ГК КП(б)Б), **Самахвалаў, Мінкін** (ЦК КП(б)Б), **Вальфсон, Мельнікаў, Абуховіч, Сальнікаў, Яноўскі, Дэрман, Казлоўскі, Розіна, Якута, Прусліна** (Дом партактыва), **Файнштэйн, Царэў** (ВКСГШБ). **Шкілтар** (БелАН), **Каулін** (ВКСГШБ), **Чорны, Шаўроў** (ЦК КП(б)Б), **Фрыд** — рэдакцыя газеты «Звязда».

КАГАНОВІЦКІ РАЁН

Балцін (Наркаммясцпром) — фабрыка «Кастрычнік», **Бенек** (Наркамзем) — фабрыка імя Кагановіча, **Бурачэўскі** (Наркомаховы здароўя) — фабрыка імя Куйбышэва, **Кудзелька** (Наркамфін) — шчотачная фабрыка, **Манахаў** (мединстытут) — шклозавод «Пролетарый», **Барзуноў** (Галоўхлеб) — хлебазавод, **Кулікаў** (ЦВК БССР) — шпалерная фабрыка, **Ашаровіч** (рэдакцыя «Окцябр») — фабрыка «Чырвоны тэкстыльшчык», **Сапрыкі** (Наркамзем) — фабрыка імя Тэльмана, **Нізаўцоў** (Камісія ўраджайнасці) — лямпавая фабрыка, **Кузьмін** (НКЮ) — менскі чыгуначны вузел, **Матусевіч** (Наркамфін) — завод імя Мяснікова, **Гофман** (Соўправа) — завод «Ударнік», **Глезераў** (НКЮ)—хімфармзавод, **Гурэвіч** (Наркомунутгандаль) — малочны завод, **Мікенас** (КСК) — завод «Чырвоны хімік», Залескі (Наркамзем) — пагельны завод № 1, **Мінынгоф** (НКЮ) — пагельны завод № 1—3, **Камянецкі** (Наркомунутгандаль) — пагельны завод № 3, **Маневіч** — (Наркомунутгандаль) — пагельны завод № 2—4, **Малоў** (Наркомунутгандаль) — пагельны завод № 5, **Раксін** (Упоўнаркамхарчгандаль) — фабрыка-кухня, **Гінзбург** (горпракуратура) — клінкерны завод, **Хейфец** (Наркомасветы) — майстэрні Белдзяржбуда, **Дабрускін** (мединстытут) — арцель «Дрэвааапрацоўшчык», **Купрэеў** (фабрыка імя Кагановіча) — Малярбуд, **Нейштат** (Наркомаховы здароўя) — мединстытут, **Пасманік** (Наркамзем)—арцель «Чырвоны друкар», **Савостаў** (Наркамзем) — арцель «Чырвоны транспартнік», **Левіт** (БКС) — арцель «Зорка», **Блюмкін** (БКС) — 1 будучастак водаканала, **Каштанаў** (Наргасучот) — кандэцерскія БЕЛКМО, **Баскін** (БКС) — арцель «Пролетарый», **Шыфрын** (НКЮ)— арцель «Іскра», **Вігдаровіч** (мединстытут) — Менгоржылсаюз, **Базіленка** (НКЮ) — майст. горсовета, **Шульгін** (ВПІ) — 4-я мех. пякарня, **Гершон** (Наркомасветы) — БДУ, **Гуцін** (Дом тэхнікі)—тарны завод, **Каплан** (Белхімлес)—скрыначны камбінат, **Мізевіч** (ЦУНГУ) — арцель «Перамога», **Арндт** (Белдзяржснабзбыт) — вагонарамонтная база, **Іўры** (Упоўнаркомлес) — млын «Адраджэнне», **Літвіненка** (спецлабараторыя Наркомаховы здароўя) — фабрыка індывідуальных заказаў, **Калента** (Наркомасветы) — ФЗВ комунальнікаў, **Фельгін** (Наркамфін) — арцель «Чалюскінец» № 6, **Кабакоў** (рэдакцыя «Окцябр»)—3 групком Белдзяржбуда, **Гольдберг** (ВПІ) — інстытут нацменшасцей, **Пам** (рэдакцыя «Окцябр») — яўрэйскі педтэхнікум, **Турэцкі** (Упаўкамзаг) — Мензаготзярно, **Карандзей** (Бродтрэст) — МІВР МБВ чыгункі, **Дзякаў** (Наркомасветы) — ВПІ.

РЭЗЕРВ

Шындлер (Наргасучот), **Пехцераў** (Наркаммясцпром), **Гвяздецкі** (Упаўкамзаг), **Ліўшыц** (РК КП(б)Б), **Геаргадзе** (Наркаммясцпром), **Хейфец** (Заготзярно), **Брандбоўскі** (Наркомасветы), **Лук'янчык** (СНК), **Кучынскі** (БДУ).

ВАРАШЫЛАЎСКІ РАЁН

Ціхон (Камісія Совецкага Кантроля) — завод імя Молатава, **Саевіч** (ВКСГШБ) — трамвайрк, **Кавальчук** (ЦСПСБ) — завод ланцугоў Галля, **Кароўнікаў** (НКЗ)—электрастанцыя, **Любовіч** (Дзяржплан) — друкарня імя Сталіна, **Галкін** (Белдзяржкіно) — фабрыка «8 сакавіка», **Лагодзіч** (Партвыдат) — завод «Пролетарый», **Топаз** (школа НКЮ) — завод стандартных дамоў, **Ларачкін** (Ленпартгарадок) — фабрыка імя Фрунзе, **Гераўкер** (ЦСПСБ) — фабрыка «КІМ», **Доагун** (Партвыдат) — арцель «Чырвоны металіст», **Рыбакоў** (тэхнікум оргучоту) — арцель «Чырвоны абутнік», **Дзякаў** (тэхнікум оргучоту) арцель імя Крупскай, **Левін** (Ленпартгарадок) — скарняжная фабрыка, **Кін** (Сельгасбанк) — 1-я хлебапякарня, **Баташоў** (№-ская часць)—дзіцячы дыспансер. **Пілілёнак** (ЦК саюза залатак) — завод, **Ліўшыц** (Белдзяржвыдат) — Белуціль, **Гайдук** (Дзяржвыдат) — трэст зялёнага насаджэння, **Галятоўскі** (Дзяржбанк) — клінічны гарадок, **Дружлоўскі** (політэхнічны інстытут) — жылземкіраўніцтва, **Азаронак** (Камісія Совецкага Кантроля) — 3-я больніца, **Бандарэнка** (2-я больніца) — лазнеральны трэст, **Зярніцкі** (КІЖ) — завод малочнай кіслаты, **Фішбейн** (электрастанцыя) — пабудова новага тэатра.

РЭЗЕРВ

Чучко (бел. тэхнікум), **Леванович** (дашкольны тэхнікум), **Бернштэйн** (ЦСПСБ), **Кавалёнак** (клінічны гарадок), **Мееровіч, Суравіч** (Ленпартгарадок), **Пракоф'ева** (ЦСПСБ), **Гераўкер** (ЦП фінбанкаўскіх работнікаў), **Партной** (ЦК запалкав-фанера), **Гелер** (ЦК сярэдніх школ), **Сакалінскі** (ЦК саюза медсанпрацы), **Клябанаў** (ЦП швейнікаў), **Аўсяннікаў, Захарава** (ЦК гандлёвых работнікаў).

ПА СЕЛЬСОВЕТАХ І КАЛГАСАХ МЕНСКАГА РАЁНА

Лынькоў (ССП), **Жукаў** (ДВБ), **Юдзін** (РВК), **Міронаў** (Белпромсовет), **Гушчын** (БЕЛТА), **Кузняцоў** (Белторф), **Ашак** (Наркомсабез), **Данільчык** (музей рэвалюцыі), **Міланаў** (ЦС АСО), **Аксенцаў** (НДІ прамысловасці), **Шнітко** (Наркомсоўгасаў), **Гурскі** (ССП), **Ільюшын** (БелАН), **Кудзельскі** (Вярхоўны суд), **Аракелаў** (Радыёкамітэт), **Залескі** (гарфа), **Шульц** (горздраў), **Вадзейка** (райана), **Крылоў** (Наркамхарчпром), **Владзімірскі** (Наргасучот), **Сарпень** (ГК МОПР), **Астроўскі** (Наркаммясцпром), **Вержбаловіч** (рэдакцыя газ. «Звязда»), **Трацюхін** (Наркомлес), **Багданскі, Лазоўскі, Пінчук** (ВКСГШБ), **Лазарэў** (вяч. комвуз), **Турко** (ЦК КП(б)Б), **Дварэцкі** (Наркомлес), **Еленеўскі** (Наркамфін), **Амбражунас** (Наркамгас), **Шкадарэвіч** (СНК), **Семенычаў** (інспекцыя па якасці), **Голуб** (Наркомлес), **Станкевіч М. А.** (БелАН), **Давідовіч** (Наркомасветы), **Малышаў** (КІЖ), **Матусевіч, Сыцько, Дарожкін, Казлоў** (БелАН), **Дзехцярэў** (НКЮ), **Юрашкевіч** (Інстытут соўправа), **Зелічонак** (БКС), **Дубінін** (НКЮ), **Гурвіч** (КСК), **Ліснеўскі** (РВК), **Пугачоў** (Гістпарт), **Гаеўскі** (БДТ-1), **Аляс** (Гістпарт), **Вальнская** (Белпушніна), **Зуенчык** (Дзяржплан), **Бекермэн** (БІМЗО), **Фрыдрых** (БДУ), **Бабкоў** (ЦП жылбудаўніцтва), **Варакса** (ЦП пагельнікаў), **Манжэлей** (ЦП саюза кааперацыі), **Лубнеўскі** (Наркамзем), **Швец** (Ленпартгарадок), **Скуман** (БІМЗО), **Скальскі** (газета «Рабочий»), **Марыненка** (Белзаготзярно).

ПА ШКОЛАХ ГОРАДА

Дз'якаў (Наркомасветы) — 1 школа, **Бурачэўскі** (Наркамат аховы здароўя) — 2 школа, **Стэрнін** (рэдакцыя «Звязды») — 3 школа, **Юнг** — 4 школа, **Любовіч** (Дзяржплан) — 5 школа, **Бенек** (Наркамзем) — 6 школа, **Гершон** (Наркомасветы) — 7 школа, **Агуроскі** (БелАН) — 8 школа, **Ціхон** (КСК) — 9 школа, **Ляўкоў** (ПВК) — 10 школа, **Хаін-Юмскі** (рэдакц. «Рабочий»), — 11 школа, **Ашаровіч** (рэдакцыя «Окцябр») — 12 школа, **Готфрыд** (ЦК) — 13 школа, **Лынькоў** (ССП) — 14 школа, **Сапоцькі** (Наркамзем) — 15 школа, **Манахаў** (мединстытут) — 17 школа, **Кабакоў** (рэдакц. «Окцябр») — 18 школа, **Сурта** (БелАН) — 19 школа, **Кудзелька** (Наркамфін) — 20 школа, **Драгілеў** (КІЖ) — 21 школа, **Кудзельскі** (Верхсуд) — 22 школа, **Лур'е** (ВКСГШБ) — 23 школа, **Жуковіч** (горсовет) — 25 школа, **Раксін** (Наркамхарчпром)— 26 школа, **Бранштэйн** (ССП) — 27 школа, **Штарыман** (Інстытут наргаса) — 28 школа, **Зюськоў** (Гістпарт) — 29 школа, **Мінкін** (рэдакц. «Большэвік Беларусі») — 30 школа, **Кавальчук** (ЦСПСБ) — 31 школа, **Балцін** (Наркаммясцпром) — 32 школа, **Нізаўцоў** (Камісія па ўраджайнасці) — 33 школа, **Прусакова** (КСК) — 34 школа, **Гурэвіч** (Наркомунутгандаль) — 36 школа, **Шчарбакоў** (БелАН) — 37 школа, **Юроў** (ВКСГШБ) — 39 школа, **Кірушын** (БелАН) — 42 школа.

УВАГА. Інструкцыйны даклад для дакладчыкаў, прапагандыстаў і агітатараў адбудзецца 25 красавіка ў 7 г. вечара, у Малой зале Дома партактыва. Дакладчык — тав. Любовіч.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Памяшканне Польскага тэатра (Совецкая, 17, тэл. 25-153)

Гастролі тэатра Чырвонай арміі БВА

СЁННЯ, 23 красавіка, ДАЛЕКАЕ

„Чырвоная зорка" ПАРТЫЙНЫ БІЛЕТ

„Пролетарый" АДВЕРЖАНЫЯ

„Інтэрнацыянал" Варожыя сцежкі

„Спартак" Каралеўскія матросы

Прадаю веласіпед (англійскі).

Даведацца: вул. К. Маркса, 5-а, кв. 2, ад 5 да 6 г. дня.

Дырэкцыя, партарганізацыя, мясцком і ўвесь калектыў работнікаў бел. аддзялення «Саюзпродмага» выказваюць глыбокае спачуванне сям'і трагічна загінуўшага дырэктара бакалейна-гастранамічнай канторы Менхарчгандля, члена КП(б)Б

тав. РЫСЯ

ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ

у МАГАЗІНЫ „ГАСТРАНОМ" і „БАКАЛЕЯ"

ПАСТУПІЛІ ВЯЛІКІЯ ПАРТЫІ ТАВАРАЎ

Каўбаса ўсіх гатункаў, ветчына. — Рыбапрадукты, кансервы, селядцы. — Масла, сыры. — Мука, крупы, цукар, чай, кофе.

Канфеты, пячэнне, варэнне, шакалад, какао. — Тарты кексы, бабкі, піражныя. — Лепшы выбар він, табачных вырабаў.

ДЗІЦЯЧЫЯ ПЕРШАМАЙСКІЯ ПАДАРУНКІ.

Усе магазіны прымаюць заказы з ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ. Карыстайцеся паслугамі СТАЛА ЗАКАЗАЎ, НЕ ТРАЦЦЕ ЧАСУ каля плыталкаў і кас. Прымаюцца заказы для ВЕЧАРОЎ.

Запомніце адрасы нашых магазінаў:

Магазін № 1 — Совецкая, 66 (супроць ГУМа), тэл. 21-251.
Магазін № 2 — Совецкая, 24 (супроць Дома ўрада) тэл. 24-907.
Магазін № 3 — Ленінская.
Магазін № 4 — Ленінская, 36, тэл 24-652.
Магазін № 14 — Парбарная, тэл. 21-200.
Магазін № 16 — Маскоўская, тэл. 21-621.
Магазіны «ГАСТРАНОМ» і «БАКАЛЕЯ» існуюць таксама ў гарадах Віцебску, Гомелі, Магілеве і Бабруйску.

ДЫРЭКЦЫЯ БЕЛ. АДДЗ. «СОЮЗПРОДМАГА».

УНІВЕРСІТЭТ ДЛЯ СТАХАНАЎЦАЎ

(Комсамольская, 25, Дом тэхнікі)

24 КРАСАВІКА

РАНІЦАЙ — ЛЕКЦЫЯ дацэнта МАСТКОВА на тэму «Дэталі сучасных машын»;

ВЕЧАРАМ — ЛЕКЦЫЯ СТАХАНАЎЦА ЗАВОДА ІМЯ ВАРАШЫЛАВА т. ХАРНАСА — «СТАХАНАЎСКІЯ МЕТАДЫ РАБОТЫ НА ПРАДОЛЬНА-СТРУГАЛЬНЫМ ВАРШТАЦЕ».

Пасля лекцый — канцэрт.

Вечарам працуе дзіцячы пакой.

30 красавіка заняткаў ва універсітэце не будзе. Чарговыя лекцыі — 6 мая г. г.

Пачатак зранку роўна ў 11 гадзін, увечары — у 7 гадзін.

РЭКТАРАТ.

СЁННЯ, 23 красавіка, у 7 гадзін вечара, у канферэнц-зале БелАН (Ленінская, 29-35)

АДБУДЗЕЦЦА

ДАКЛАД праф. БАРАНСКАГА Н. Н.

на тэму «ГЕАГРАФІЯ СССР» (вывучэнне нашай радзімы).

Запрашаюцца выкладчыкі геаграфіі ў ВНУ і сярэдніх школах, студэнты і ўсе жадаючыя.

Уваход вольны.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА ЭКАНОМІКІ БелАН.

Да ведама арганізацый, устаноў, школ і піонератрадаў

ДА ПЕРШАМАЙСКІХ УРАЧЫСТАСЦЕЙ

у магазіны Менпромгандля № 3—Ленінская, 9-2. тэл. 22-421, № 29—Ленінская, 4

паступілі ў продаж шаўковыя СЦЯГІ з вышытым партрэтам тав. Сталіна,

а таксама СЦЯГІ для піонератрадаў і школ.

Па патрабаванню пакупнікоў на сцягах будуць зроблены любыя вышыўкі.

Сцягі могуць быць высланы ў любы раён наклаўным плацяжом.

МЕНПРОМГАНДАЛЬ

Аб'ява аб рэгістрацыі.

НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР,

на падставе палажэння і правіл аб дзяржаўнай рэгістрацыі (аборнік законаў і распараджэнняў Урада СССР 1931 г. № 8 ст. 99 і бюлетэнь фінансавага і гаспакавучага заканадаўства 1931 года № 12), 29 сакавіка 1936 г. зарэгістравана ў рэестры дзяржаўнай рэгістрацыі пад № 131 66

МЕНСКАЯ КАНТОРА ТРЭСТА „ДЗЯРЖСАНТЭХМАНТАЖ"

Адрас: г. Менск, пляц Волі, 23.

НАРКАМФІН БССР.

АДРАС РЭДАКЦЫІ і выдавецтва «Звязды»: Совецкая, 63. Тэлефоны: Адказны рэдактар—21-352; нам. адказнага рэдактара—25-188; сакратарыят—20-830; партыйны аддзел—21-353; аддзел літаратуры і мастацтва—25-189; сельгасаддзел—21-846; аддзел мясцовай і заменнай інфармацыі—23-955; прамысловы і совецка-гандлёвы аддзел — 21-356; стыльрэдактура—22-412; машыннае бюро і прыём тэлефанаграм — 21-351, аддзел пісем—21-399; 21-885; заг. выдавецтва—21-358; спецсектар—23-966; бухгалтэрыя—21-845; аддзел аб'яў—21-845; учотна-тыражны аддзел—21-360.

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 68. Уп. Галоўлітбела № Ш—3252.